

НАВУКА ЦЫВІЛІЗАВАНАГА ГАНДЛЮ 3



ГАЛАЎНЫ БОЛЬ НАПРУЖАННЯ 7

26 ЛЮТАГА 2020 г.
СЕРАДА
№ 38 (29152)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

# Ад рэалій і на перспектыву

**З такім прыцэлам разглядаліся кандыдаты на пасады першых наместнікаў старшыні КДБ і міністра ўнутраных спраў. Фармат «кадравага дня» ўчора быў зменены кіраўніком дзяржавы: на прадстаўленні кандыдатур, акрамя дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі і кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прысутнічалі старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі і міністр унутраных спраў. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў: першыя намеснікі — ключавыя фігуры, якія ў выпадку неабходнасці павінны, самае меншае, быць здольныя ўзначаліць структуры, у якія прызначаюцца.**

Яшчэ адно патрабаванне лідара краіны — новыя начальнікі не павінны цягнуць за сабой тых, з кім раней працавалі. Кадры трэба абнаўляць, але не такім чынам. Калі былыя калегі — прафесіяналы, ніхто не забараняе іх рэкамендаваць у іншыя структуры, змагацца за іх, але не трэба іх прыстройваць «пад сябе», падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Абавязкова павінна быць ракіроўка пры прызначэнні кадраў», — запатрабаваў ён.

Падчас прадстаўлення кандыдатаў кіраўнік дзяржавы пагутарыў з кожным. На вакансію першага намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка крымінальнай міліцыі быў прадстаўлены палкоўнік міліцыі Генадзь Казакевіч, які да гэтага ўзначальваў галоўнае ўпраўленне па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС.

Аляксандр Лукашэнка спытаў, якое месца займае ўпраўленне, якое ўзначальваў Казакевіч, у крымінальнай міліцыі. Палкоўнік міліцыі лічыць, што гэтае падраздзяленне найбольш прасунутае, бо ў сферы абароту наркотыкаў зладзеі больш вытанчаныя, а злачынствы здзяйсняюцца з выкарыстаннем высокіх тэхналогій.

«Цяпер вытанчаныя ўсе, і крымінальнікі, і наркадзялкі, і гандляры людзьмі, ніхто адкрыта на гэту вайну не ходзіць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што 70 працэнтаў злачынстваў адбываецца па лініі крымінальнага вышуку (супраць маёмасці і ўласнасці грамадзян), таму яго хвалюе, наколькі новы першы намеснік міністра гатовы займацца гэтым кірункам. Генадзь Казакевіч паведаміў, што праходзіў службу на пасадзе начальніка следчага ўпраўлення горада, дзе расследаваліся злачынствы, у тым ліку крымінальнага характару, мае вопыт работы і ў раскрыцці эканамічных злачынстваў. «Аператыўна-вышуковая дзейнасць аднолькавая для ўсіх падраздзяленняў крымінальнай міліцыі, — адказаў ён. — Вядома, спецыфіка ёсць. Буду ўнікаць у яе і арганізоўваць работу».



Фота БелТА.

**Прэзідэнт прызначыў Генадзя Казакевіча першым намеснікам міністра МУС.**

**На пасаду першага намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі кіраўнік дзяржавы прызначыў генерал-маёра Сяргея Церабава,** які да гэтага ўзначальваў упраўленне КДБ па Гомельскай вобласці.

**На яго месца ў Гомелі прызначаны палкоўнік Аляксандр Мельнікаў,** які да гэтага займаў пасаду начальніка ўпраўлення ўласнай бяспекі КДБ.

«Калі Прэзідэнт прымаў кадравае рашэнне, ён асабліва падкрэсліў важнасць арганізацыі кадравай работы ведамства, абазначыў неабходнасць пастаяннага павышэння ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі супрацоўнікаў, забеспячэння пераемнасці ў рабоце — з улікам гэтага былі пастаўлены адпаведныя задачы», — расказаў потым журналістам новы першы намеснік старшыні КДБ Сяргей Церабаў.

СТАР. 2

# Час бліны есці



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БелТА.

На «Провадах зімы» ў Каробчыцах пад Гроднам.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СІЗОЎ, намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім»:**

*«Па пытанні кампенсацыі за брудную нафту вядзецца ўжо падпісаны пратакол, што расійскі бок гатовы кампенсаваць. Ідзе работа, накіраваная на ўстанаўленне і пацвярджэнне тых кампенсацыйных выплат, якія ў выніку павінны быць пералічаныя на адрас Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. Гаворка ідзе пра суму па аналогіі з іншымі бакамі, якія былі ўцягнутыя ў гісторыю з бруднай нафтай, — гэта контрагенты ў Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі. З адкрытых крыніц стала вядома, што яны атрымалі кампенсацыю ў памеры $15 на бараль пастаўленай нафты з павышаным утрыманнем хлараргнікі».*

75 Вялікая Перамога

# ДАРОГАМІ СЛАВЫ

**Напярэдадні 75-годдзя вызвалення Беларусі «Звязда» запускае новы праект. Сумесна з Музеем гісторыі Узброеных Сіл Беларусі мы будзем знаёміць чытачоў з ваенным шляхам поўных кавалераў ордэнаў Славы, якія паходзяць з нашай краіны.**

**Гэтая ўзнагарода была заснавана 8 лістапада 1943 года. Яе з'яўленню папярэднічала вызваленне Кіева, якое адбылося двума днямі раней. Байцы праявілі такую мужнасць пры фарсіраванні Дняпра, што існуючых на той час узнагарод не хапала, каб аддзячыць радавы і сяржанцкі састаў за подзвігі. Узнагароджваць ордэнам Славы маглі радавых, сяржантаў, а таксама малодшых лейтэнантаў Ваенна-паветраных сіл.**

**Крытэрыі для атрымання ўзнагароды былі жорсткія. Напрыклад, знаходзячыся ў танку, які загарэўся, працягваць выконваць баявую задачу; з асабістай зброі стральбой знішчыць ад 10 да 50 салдат і афіцэраў праціўніка; асабіста захапіць у палон варожага афіцэра; рызыкуючы жыццём, выратаваць у баі камандзіра ад небяспекі; грэбуючы асабістай бяспекай, захапіць у баі варожы сцяг; параненым пасля перавязкі зноў вярнуцца ў строй; з асабістай зброі збіць самалёт**



**саперніка; імкліва ўрэзаўшыся на сваім танку ў калону саперніка, скамячыць яе і працягваць выконваць баявую задачу; здабыць каштоўныя звесткі падчас разведкі. І гэта толькі кароткі пералік.**

**...У Беларусі, на жаль, ужо не засталося ў жывых поўных кавалераў ордэна Славы. Апошні з іх — Віктар Веташкін, які камандаваў мінамётным разлікам, адышоў у лепшы свет у чэрвені 2015 года. Тым каштоўнейшыя цяпер здымкі ветэранаў, зробленыя ў мінулыя дзесяцігоддзі нашым фотамайстрам Анатолем Клешчуком.**

СТАР. 3

Вынікі і планы

# Павысіць выяўляльнасць хвароб, працягласць жыцця і зарплаты медработнікаў

Пра што размаўлялі на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя

**У 2019 годзе медыцынскую дапамогу ў Беларусі аказвалі на належным узроўні. Дасягнуты экстрэмальна нізкія паказчыкі дзіцячай і мацярынскай смяротнасці, павялічылася працягласць жыцця. Пры гэтым дэмаграфічны прырост насельніцтва скарачаецца, і лічбы па нараджальнасці ў найбліжэйшыя гады застануцца нізкія. У краіне за год выканана амаль 20 тысяч кардыёхірургічных аперацый, а выяўляльнасць анкалагічных хвароб на ранняй стадыі склала 67,4 %, што дае магчымасць разлічваць на павелічэнне працягласці жыцця. Заканчваецца рэканструкцыя Асіповіцкай цэнтральнай раённай бальніцы і будаўніцтва Астравецкай цэнтральнай раённай бальніцы. У 2020-м працягнецца работа па павелічэнні зарплат медработнікаў. Пра самыя значныя дасягненні мінулага года, праблемы і планы на будучыню ішла размова на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя.**

## За кошт чаго плануецца зніжаць захваральнасць?

Дэмаграфічная сітуацыя ў краіне застаецца напружаная, яна тлумачыцца шэрагам прычын, у прыватнасці, нізкім узроўнем нараджальнасці і старэннем насельніцтва, адзначыў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.** Каэфіцыент нараджальнасці працягвае зніжацца: у 2019-м ён склаў 9,4 праміле, а год таму быў 10,1 праміле.

— Адмоўны дэмаграфічны прырост абумоўлены структурай насельніцтва — змяншэннем колькасці жанчын фертыльнага ўзросту, тым, што мяняюцца сацыяльныя перавагі — беларускі сталі пазней уступаць у шлюб і нараджаць дзяцей, — растлумачыў Уладзімір Каранік.

СТАР. 2

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## На Уол-стрыт абваліліся фондавыя індэксы

Амерыканскі прамысловы індэкс Dow Jones скараціўся на 1031,61 пункта з-за апасенняў інвестараў, звязаных з распаўсюджваннем новага каранавіруса. Таргі на Нью-Ёркскай фондавай біржы паказалі найгоршы вынік за два гады. Індэкс страціў усе набыткі, дасягнутыя з пачатку гэтага года. Значна скараціліся і іншыя ключавыя амерыканскія індэксы, такія як S&P 500, які ўключае найбуйнейшыя кампаніі фондавага рынку ЗША, і індэкс электроннай біржы Nasdaq. Найбольшыя страты ў акцый такіх авіякампаній, як Delta, American Airlines і United Airlines. Гэта вынік рэзкага скарачэння колькасці палётаў на кітайскім напрамку. Пацярпелі і акцыі амерыканскіх кампаній, чыя вытворчасць у значнай ступені размешчана ў Кітаі, у тым ліку Apple і NVidia. Найбагацейшыя людзі планеты пазбавіліся за суткі 139 мільярдаў долараў. У прыватнасці, генеральны дырэктар групы кампаній LVMH Бернар Арно і кіраўнік Amazon Джэф Безас страцілі па $4,8 мільярда.



## На карнавале ў Германіі аўто пратараніла натоўп людзей

Не менш за 30 чалавек, у тым ліку дзеці, пацярпелі ў выніку наезду. Кіроўца Mercedes-Kombi на поўнай хуткасці ўляцеў у натоўп удзельнікаў параду ў горадзе Фолькмарзене ў зямлі Гесэн, што ў цэнтральнай Германіі. Дзесяць чалавек атрымалі сур'ёзныя траўмы, сярод іх ёсць маленькія дзеці. Па словах відавочцаў, мужчына наўмысна накіроўваў машыну на людзей



і нават спецыяльна цэліў у тое месца, дзе стаяла больш за ўсё непаўналетніх. Машына праехала каля 30 метраў праз натоўп, пакуль не спынілася. Кіроўца пры гэтым працягваў ціснуць на газ. Злачынца затрымалі, гэта аказаўся 29-гадовы грамадзянін ФРГ. Яму прад'яўлена абвінавачанне ў наўмысным наездзе. Матывы ўчынку пакуль невядомыя. Па звестках інтэрнэт-партала часопіса Der Spiegel, кіроўца знаходзіўся ў стане цяжкага алкагольнага ап'янення. Яго суседка расказала тэлеканалу RTL, што бачыла, як мужчына ад'язджаў ад дома. «Ён выглядаў так, нібыта быў пад наркотыкамі, і сказаў, што «хутка пра мяне напішуць газеты», — заявіла жанчына.

## Памёр апошні маршал Савецкага Саюза Дзмітрый Язаў



Былы міністр абароны і апошні маршал Савецкага Саюза Дзмітрый Язаў памёр на 96-м годзе жыцця. Пра гэта паведамілі ў Мінабароны РФ. Прычынай смерці стала цяжкая і працяглая хвароба.

Язаў быў апошні міністр абароны СССР і апошні маршал Савецкага Саюза, які заставаўся ў жывых. Ваенным ведамствам ён кіраваў з мая 1987 года да жніўня 1991 года. Менавіта ў гэты час савецкія войскі былі выведзены з Афганістана. Язаў таксама быў членам ЦК КПСС і кандыдатам у члены Палітбюро ЦК з 1987 года, а з 1990-га — членам прэзідэнцкага савета СССР, затым членам Савета бяспекі СССР. У жніўні 1991-га ён як член ГКЧП даў загад аб уводзе танкаў і іншай ваеннай тэхнікі ў Маскву. Яго арыштавалі па прылёце ў аэрапорт Унукава з Фароса і абвінавацілі ў дзяржаўнай здрадзе. У лютым 1994-га Язаў трапіў пад амністыю.

ISSN 1990 - 763X
9 771990 763008 20038

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт падпісаў указ аб развіцці АПК Віцебскай вобласці.**
- Суадносіны сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй зарплаты ў студзені склалі 39,9 %.
- **У Байнэце стартуе маштабная праграма па падтрымцы беларускай мовы.**
- З-за бруднай нафты з Расіі і абмежаванняў на вываз нафтапрадуктаў экспарт Беларусі знізіўся больш чым на $2 млрд.
- **На БелАЭС уключана ў работу чацвёртая высакавольтная лінія.**
- Новы корпус Пінскага міжраённага анкадыспансера плануюць летам увесці ў строй.
- **У Мінску жанчына выскачыла з акна 8-га паверха і не пацярпела.**
- У Японіі ва ўзросце 112 гадоў памёр найстарэйшы мужчына ў свеце.





# СМЯРОТНАЯ ЮШКА

Як парыбачыць без наступстваў?

**Хоць адыходзячая зіма застаецца хіба што толькі на календары, але адсутнасць снегу і нячастыя адмоўныя тэмпературы не палохаюць фанатаў зімовай рыбалкі. Здавалася б, што можна рабіць на вадаёмах у такіх неспрыяльных умовах? Не атрымалася сёлета з зімой — ну што ж зрабіць, трэба чакаць наступную. Але далёка не ўсе рыбакі гатовы прыслухацца да логікі. І тым самым папаўняюць статыстыку няшчасных выпадкаў. Заўважана, што на смяротную рызыку ідуць людзі, якія, здавалася б, павінны быць умудроныя жыццёвым досведам. Усім патанулым рыбакам за няпоўныя два месяцы 2020-га ўжо перавалiла за пяцьдзясят.**



— Бяспечная таўшчыня лёду для таго, каб там мог знаходзіцца чалавек, — не менш за сем сантыметраў, — нагадвае **вядучы спецыяліст Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства ратавання на водах» Алег БАРАЗНА.** — Але час, калі лёд «нарастаў» да такой велічыні, сёлета быў вельмі непрацяглы. Надвор'е яшчэ са снежня стаіць, мякка кажучы, не зусім зімовае. Хутчэй за ўсё, ужо і не сфармуецца паўнавартаснае лядовае пакрыццё. Такая абстаноўка на маёй памяці ўпершыню. Таму лепш схадзіць у краму і купіць гэты самы кілаграм рыбы, а не рызыкаваць сваім жыццём.

Лёд, аднак, утвараўся на вадаёмах Магілёўскай і часткова Віцебскай і Гомельскай абласцей. А вось на захадзе і ў цэнтры краіны гэтага так і не адбылося. Ды і тое, фарміраваўся лёд толькі на тых вадаёмах, дзе мінімізаваны рух паветра, адсутнічае цячэнне.

СТАР. 2

# АД РЭАЛІЙ І НА ПЕРСПЕКТЫВУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Генерал-маёр дадаў, што новая пасада прадугледжвае вырашэнне задач выключнай кампетэнцыі КДБ (арганізацыя контрразведвальнай дзейнасці, барацьба з тэрарызмам і іншае). Гэтыя кірункі былі канкрэтызаваныя, асобна Прэзідэнт спыніўся на пытаннях супрацьдзеяння карупцыі — абазначыў неабходнасць здабывання вычарпальных доказаў, недапушчальнасць фармалізму, шаблоннасці ў рабоце, дублявання задач паміж праваахоўнымі органамі.

Абстаноўка цяпер у Беларусі стабільная, кантраляваная, сказаў журналістам толькі што прызначаны першы намеснік старшыні КДБ. «Неабходна мець на ўвазе транзітны характар нашай краіны, — адзначыў ён. — І тут асноўная задача — недапушчэнне дэструктыўнага ўплыву звонку, на гэтым будуць сканцэнтраваны асноўныя намаганні ў нашай рабоце».

Першы намеснік міністра ўнутраных спраў Генадзь Казакевіч нагадаў журналістам, што галоўная задача міліцыі — захаванне жыцця, здароўя і ўласнасці грамадзян.

«За апошнія гады дзякуючы намаганням не толькі МУС, але і ўсіх зацікаўленых намеціўся станоўчы трэнд на зніжэнне колькасці агульнакрымінальных злачынстваў (крадзяжы, рабаванні, разбоі, замахі на жыццё і здароўе грамадзян). Мы павінны ўсяляк яго ўмацоўваць, — сказаў ён. — Яшчэ адна задача, якую паставіў кіраўнік дзяржавы, — супрацьдзеянне карупцыі, якое павінна насіць сістэмны характар. Гэта значыць, мы павінны займацца тымі злачынствамі, якія наносяць найбольшую шкоду інтарэсам дзяржавы і грамадства, а не засяроджвацца на дробнай, так званай бытавой карупцыі».

Што датычыцца змагання з кіберзлачыннасцю, МУС ужо некалькі гадоў рыхтуе кадры ў гэтай сферы. «Мы стварылі падраздзяленне інтэрнэт-разведкі, якое паспяхова супрацьдзейнічае гэтаму злу па ўсіх кірунках, ці тое гандаль наркотыкамі, ці тое сексуальны гвалт у адносінах да дзяцей у сетцы Інтэрнэт, — дадаў прызначаны першы намеснік міністра. — Беларускі вопыт запатрабаваны і прызнаны ў свеце».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Павысіць выяўляльнасць хвароб, працягласць жыцця і зарплаты медработнікаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У такіх умовах узрастае роля медыцыны ў захаванні рэпрадуктыўнага здароўя насельніцтва. Важна зрабіць усё магчымае, каб пары, якія жадаюць мець дзяцей, маглі гэта ажыццявіць, падкрэсліў міністр. Дарэчы, узровень бясплоднасці ў Беларусі складае 14 %.

— Наша задача — не толькі зніжэнне смяротнасці, але і павышэнне нараджальнасці за кошт прафілактыкі абортаў, даступнасці і эфектыўнасці дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій. Сёлета дзякуючы псіхалагічнай дапамозе і перадабортнаму кансультаванню ўдалося захаваць да 19 % цяжарнасцяў. І гэта нямала для нашай краіны. У 2019-м колькасць абортаў знізілася з 9,0 да 8,2 на тысячу жанчын фертыльнага ўзросту, — расказаў Уладзімір Каранік.

Пры гэтым ён адзначыў, што нізкія лічбы нараджальнасці будуць захоўвацца і ў найбліжэйшыя гады. Таму важнай задачай з'яўляецца зніжэнне захваральнасці, інваліднасці і смяротнасці.

Задача пярвічнага звяна — павысіць выяўляльнасць сардэчна-сасудзістых хвароб, захворванняў парушэнняў абмену рэчываў і іншых цяжкіх паталогій. Што датычыцца выяўлення анкалагічных хвароб, то ў 2019-м дасягнуты нядрэнныя вынікі: 67,4 % з іх выяўлялася на ранніх, 1-2-й стадыях. Усё гэта павінна прывесці да зніжэння смяротнасці, падкрэсліў міністр.

Па-ранейшаму высокімі тэмпамі развіваецца беларуская трансплантацыя. Летась выканана 374 трансплантацыі ныркі, у тым ліку 11 дзецям, 52 перасадкі сэрца. А таксама 93 аперацыі па трансплантацыі печані, з іх 12 дзецям. Прычым у маленькіх пацыентаў гэта, як правіла, экстранныя аперацыі, якія дазволілі захаваць ім жыццё. Праведзена 9 перасадак лёгкіх, 148 — гемапаэтычных ствалавых клетак. Будаўніцтва новага модуля і хірургічнага комплексу на тэрыторыі Мінскага НПЦ хірургіі, трансплантацыі і гематалогіі дазволіць і далей развіваць гэты кірунак, адзначыў міністр.

У краіне праведзена амаль 20 тысяч кардыёхірургічных умяшанняў. А РНПЦ «Кардыялогія» з'яўляецца адным з самых запатрабаваных не толькі ў беларусаў, але і ў замежных грамадзян. Экспарт паслуг за студзень—лістапад мінулага года склаў 44,6 мільёна долараў (а гэта102 % да ўзроўню 2018-га). Найбольшы ўнёсак зрабілі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі і РНПЦ «Кардыялогія».

Розніца ў працягласці жыцця паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам хоць і скарачаецца, але па-ранейшаму ёсць.

— Што датычыцца Мінска, то, з аднаго боку, тут самыя нізкія ў краіне паказчыкі смяротнасці. А з іншага, назіраецца невыкананне цягам шэрагу гадоў нарматыву забяспечанасці ўрачамі агульнай практыкі, — звярнуў увагу міністр. Ён заклікаў вырашаць кадравыя праблемы, у прыватнасці ўдасканаліць сістэму паслядыпломнай адукацыі.

## Навошта акрэдытацыя медыцынскіх устаноў?

— З гэтага года ўсе дзяржаўныя медыцынскія ўстановы пройдуць працэдуру акрэдытацыі на адпаведнасць базавым стандартам. Гэта патрабаванні, якія будуць характарызаваць бяспеку і ўзровень аказання медыцынскай дапамогі. Калі ў нейкай установе на гэтым узроўні бяспечна аказваць медыцынскую дапамогу немагчыма, установа не будзе акрэдытавана для такіх відаў дапамогі. Такім чынам, спецыялізаваная дапамога будзе сканцэнтравана ў тых цэнтрах, дзе сёння ёсць усё неабходнае абсталяванне і кадры, якія дазваляюць усё выканаць на сучасным бяспечным узроўні, — заявіў Уладзімір Каранік.

Напрыклад, аказанне неўралагічнай дапамогі ў стацыянары, дзе няма камп'ютарнага і магнітна-рэзанансчага тамографаў, нельга прымяніць сучасныя методыкі лячэння, якія зніжаюць рызыку інваліднасці і дазваляць пацыенту больш поўна аднавіцца, немэтазгодна. Таму гэта дапамога будзе сканцэнтравана ў тых медустановах, якія па аснашчэнні адпавядаюць сучаснаму ўзроўню. Яны будуць знаходзіцца ў гадзіннай даступнасці для любога пацыента краіны.

Плануецца, што будуць два віды акрэдытацыі: базавая — абавязковая для дзяржаўных медыцынскіх устаноў, і добраахвотная, якую змогуць праходзіць у тым ліку і недзяржаўныя медыцынскія ўстановы — гэта дасць магчымасць прадэманстраваць, што іх дапамога адпавядае сучасным медыцынскім стандартам. Фінансаванне ўсіх тых відаў дапамогі, якія не прайшлі акрэдытацыю, з рэспубліканскіх і мясцовых бюджэтаў не дапускаецца.

Акрэдытацыю медустановы пачнуць праходзіць з гэтага года, а ў поўным аб'ёме сістэма будзе функцыянаваць з 1 студзеня 2023 года.

## Адкуль у нас тэсты на каранавірус?

У Беларусі па-ранейшаму ніводнага выпадку завозу каранавіруснай інфекцыі не зафіксавана. Актыўна праводзяцца санітарна-эпідэмічныя мерапрыемствы.

На сёння некалькі разоў у дзень аналізуецца эпідэміялагічная сітуацыя. У прыватнасці, узмоцнены кантроль на рэйсах, што прыбываюць з Італіі. Таксама праводзіцца медыцынскае назіранне за грамадзянамі, якія вярнуліся з КНР, узмацняецца назіранне за тымі, хто вяртаецца з паўночнай Італіі, расказаў міністр.

— Адкуль у нас узоры, калі завозу віруса не было? ДНК віруса была перададзена Сусветнай арганізацыяй усім зацікаўленым, гэта дазволіла скласці тэст-сістэмы, каб праводзіць ПЦР-дыягностыку ў рэжыме рэальнага часу. Зараз у нас два віды тэстаў: вырабленыя айчыннай вытворчасцю і перададзеныя расійскім бокам. На сёння ў асобных выпадках мы робім двайны кантроль. Лабараторныя тэсты ёсць у дастатковай колькасці, іх якасць праверана незалежнымі экспертамі, і мы не сумняваемся ў ёй, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

## Зарплаты медыкаў працягнуць расці

Міністр паведаміў, што па звестках на 2019 год сярэдняя зарплата работнікаў аховы здароўя склала 776 рублёў. Пры гэтым урачы атрымлівалі ў сярэднім 1422 рублі (з сярэднім каэфіцыентам сумяшчальніцтва 1,36), сярэдні медыцынскі персанал — 876 рублёў (пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,26).

— Студзень прайшоў спакойна, мы фіксавалі адзінкавыя выпадкі зніжэння на месцах заработнай платы, і пытанні аператыўна вырашаліся, — заўважыў Уладзімір Каранік.

Па яго словах, у 2020 годзе работа па павышэнні зарплаты медыкаў працягнецца. У тым ліку за кошт пазабюджэтнай дзейнасці. І, як і планавалася, да 2025 года ў параўнанні з 2019-м яна павінна вырасці ў два разы.

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** звярнуў увагу на недапушчальнасць ураўнілаўкі ў зарплатах.

— Узровень заробку павінен быць супастаўны з канкрэтным унёскам кожнага работніка, нагрузкай і выкананым аб'ёмам работ. У гэтым пытанні ўсё павінна быць празрыста і зразумела для людзей, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

**Алена КРАВЕЦ.**

Супрацоўніцтва

# БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКІ ЗАСЛОН ДЛЯ НАРКОТЫКАЎ

**Цэнтральны апарат Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз наведала дэлегацыя з Агенцтва па барацьбе з наркотыкамі ЗША. Выканаўца абавязкаў Рэгіянальнага дырэктара па рэгіёне Сярэдняга Усходу Майкл П. Навакоскі і старшыня ДКСЭ Андрэй Швед падпісалі адмысловы мемарандум аб супрацоўніцтве.**

Цяпер дзве краіны будуць вельмі шчыльна супрацоўнічаць на ніве барацьбы з наркатрафікам. Сярод прыярытэтных кірункаў — абмен інфармацыяй пра крыніцы паходжання наркотыкаў, іх аналагаў, прэкурсораў і метады іх устанаўлення; новыя віды наркотыкаў, іх спосабы і метады даследавання, у тым ліку параўнальныя метады. А таксама — выкарыстанне найноўшага аналітычнага абсталявання, якое прымяняецца падчас экспертызы новых псіхатропаў.

— У Злучаных Штатах асаблівую небяспеку ўяўляюць гераін, фентаніл і разнастайныя апіёіды, — зазначыў Майкл П. Навакоскі. — Але гэта ўласціва не толькі для нашай краіны, а для ўсяго свету. Калі я толькі заступіў на цяперашнюю пасаду, мяне праінфармавалі, што наркагандляры выкарыстоўваюць тэрыторыю Беларусі ў якасці транзітнай. Прычым як з усходу на захад, так і ў адваротным напрамку. Цяпер жа мы аб'ядноўваем нашы высілкі, каб разам супрацьстаяць пагрозе.

Здавалася б, магчымасці ЗША і Беларусі проста непараўнальныя па многіх кірунках. Але ў нашай краіне створана цікавая сістэма, скіраваная на прафілактыку з'яўлення новых, пакуль яшчэ непадкантрольных рэчываў.

— Амерыканскія калегі адзначаюць, што аналагаў такой методыкі ў свеце не існуе, — адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй Швед. — Калі ў многіх краінах ад з'яўлення новага наркатычнага рэчыва да ўнясення яго ў спіс забароненых праходзіць ад шасці да васямнаццаці месяцаў, то ў Беларусі гэты час змяншаецца да двух сутак. Дзейнічае такая сістэма з красавіка 2014 года, і за гэты час «наркаспісы» папоўнілі 250 новых рэчываў. Мы, у сваю чаргу, зацікаўлены, каб калегі з ЗША таксама перадавалі нам аналагічную інфармацыю, і будзем дзяліцца сваімі напрацоўкамі з імі.

Мемарандум разлічаны не толькі на ўзаемны абмен інфармацыяй, але і на двухбаковае навучанне і стажыроўку амерыканскіх і беларускіх спецыялістаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Цэнтр еўрапейскага біятлона ў Раўбічах

## Сёння там стартуе чэмпіянат Еўропы

**У першы дзень спаборніцтваў пройдуць суперспрынты. Гэтыя гонкі складаюцца з двух этапаў: кваліфікацыя і фінал, якія пройдуць у адзін дзень.**



Усе спартсмены ўжо прыбылі на месца спаборніцтваў у пачатку тыдня, біятланісты правялі свае кантрольныя трэніроўкі. Надвор'е не перашкода спаборніцтвам, арганізатары і з плюсавай тэмпературай у дзённы час здолелі падрыхтаваць трасу. Дарэчы, на адзін спрынтарскі круг выходзіць каля 3000 кубаметраў снегу пры шырыні шасці метраў і таўшчыні покрыва 50 сантыметраў. На дапамогу арганізатарам прыйшлі беларускія гарналыжныя цэнтры, да таго ж пасля завяршэння Кубка свету па фрыстайле снег знялі і з гэтага схілу.

«Цяпер ночы сталі даволі халодныя, трасу скоўвае, а адпускае толькі да гадзіны дня. Крытычны прамежак надыходзіць з 13.00 да 16.00. Затым тэмпература зноў падае, і снег трымаецца, — расказаў журналістам **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту Леанід КАРАСЬ.** — Стадыён — вельмі праблемнае месца. Сонца ўжо зусім не студзеньскае, яно стала вельмі актыўнае, і стан белага покрыва на гэтым участку пастаянна патрабуе нашай увагі. Шчыра кажучы, папярэдні прагноз надвор'я на тыдзень не радуе. Тым не менш я ўпэўнены, што ніякіх пераносаў не будзе. Запасаў снегу для правядзення чэмпіянату Еўропы па біятлоне ў нас хопіць. Так што, думаю, з пастаўленай задачай справімся і правядзём гэтыя спаборніцтвы на звыкла высокім узроўні».

Арганізатары паклапаціліся аб камфортных умовах не толькі для спартсменаў, але і для гледачоў. На стадыёне ўсталявалі адмысловы экран, каб было зручна сачыць за стральбой біятланістаў. Дарэчы, да пачатку тыдня было прададзена каля двух тысяч білетаў, і чакаецца, што ў апошнія дні аматары спорту будуць купляць іх яшчэ больш актыўна. Як заўсёды, каля стадыёна будуць адчыненыя пункты харчавання.

Хто не зможа дабрацца да стадыёна, зможа паглядзець чэмпіянат Еўропы ў прамой трансляцыі па телеканале «Беларусь 5». Белтэлерадыёкампанія будзе выкарыстоўваць 31 камеру і 2 ПТС, два краны з камерамі ўстаноўлены на трасе і яшчэ адзін на стрэльбішчы. Таксама штодня ў Раўбічах будзе працаваць студыя, куды рэгулярна стануць зазіраць спартсмены і трэнеры.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Тэхналогія ў дапамогу

# НОВЫ ПАМОЧНІК АНКОЛАГАЎ

**У Гомельскім абласным клінічным анкалагічным дыспансеры з'явіўся новы камп'ютарны тамограф для максімальна дакладнай дыягностыкі ракавых пухлін. Абсталяванне, якое было закуплена яшчэ ў 2009 годзе, адпрацавала свой рэсурс: стары тамограф часта ламаўся. Рамантавалі, пацыентаў перанакіроўвалі ў іншыя медустановы. З 2018-га — тут КТ увогуле не рабілі. Летась падчас «Вялікай размовы» з Прэзідэнтам Беларусі аб рашэнні балючага пытання папрасілі жыхары рэгіёна — сваякі пацыентаў анкадыспансера. Станоўчы вынік не заставіў сябе чакаць. Гэта агульная перамога медыкаў і пацыентаў.**




Пацярпелая ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС Гомельская вобласць традыцыйна лідзіруе ў сумным рэйтынгу росту анкалагічных захворванняў. Прычыны розныя, адзначаюць гомельскія медыкі. Рост паталогіі ў нейкай ступені звязаны і з павелічэннем працягласці жыцця, праблемамі з дыягностыкай і дрэннай прафілактыкай захворванняў. Аднак фактам застаецца тое, што летась у вобласці выявілі каля 8000 новых выпадкаў. Кожны 28-ы жыхар праходзіў лячэнне або працягвае лячыцца ад раку.

Камп'ютарная тамаграфія дазваляе медыкам паставіць дакладны дыягназ без якіх-небудзь умяшанняў у арганізм. Дыягностыка дае магчымасць урачу-рэнтгенолагу вызначыць, дзе знаходзіцца пухліна, якіх яна памераў, што адбываецца з сумежнымі органамі і ўвогуле наколькі распаўсюдзіліся ракавыя клеткі ў арганізме чалавека. Усе гэтыя даныя неабходны, каб у далейшым максімальна дакладна паставіць дыягназ, значна скараціць тэрмін абследавання і выпрацаваць эфектыўную тактыку лячэння пацыента. Акрамя таго, дэталёвая візуалізацыя дапамагае хірургам-анколагам лепш планаваць будучыя аперацыі.

Па словах **загадчыка рэнтгенаўскага аддзялення анкадыспансера Міхаіла ГАПЕЕНКІ**, за апошнія сем гадоў колькасць даследаванняў, якія праводзяцца ва ўстанове, вырасла ўдвая.

— Гэта камп'ютарны тамограф апошняга пакалення, які імгненна робіць 80 зрэзаў, што дазваляе цалкам абследаваць чалавека за 20 секундаў, — адзначае суразмоўнік. — Прынцып дзеяння гэтага апарата не адрозніваецца ад папярэдняга. Аднак у плане радыяцыйнай бяспекі новае абсталяванне больш ашчаднае: тамограф працуе ў чатыры разы хутчэй. На даследаванне грудной клеткі, напрыклад, хопіць трох секундаў.

Робіцца серыя рэнтгенаўскіх здымкаў пад рознымі вугламі, пасля чаго мадэлюецца трохмерны малюнак органа з магчымасцю разгледзець яго структуру на «зрэзе». Новы тамограф дазваляе ўбачыць тканіны органа ў вельмі тонкім зрэзе — 0,5 мм. А значыць, тлумачаць спецыялісты, паталагічныя змены ў арганізме можна выявіць на больш раннім этапе і пазбегнуць згубных наступстваў.

Кошт новага тамографа — 856 тысяч рублёў. Ён набыты на сродкі рэспубліканскага бюджэту. Праектна-мантажныя работы па будаўніцтве новага кабінета камп'ютарнай тамаграфіі абышліся ў больш чым 524 тысячы рублёў. Сродкі выдаткаваў абласны бюджэт.

Дарэчы, стары камп'ютарны тамограф плануюць адрамантаваць і таксама далучыць да абслугоўвання пацыентаў. Так, напрыклад, апарат дазваляе з камфортам абследаваць пацыентаў вялікай камплекцыі (да 210 кг) або тых, хто баіцца замкнёнай прасторы. Выкарыстанне двух тамографаў дазволіць у разы павялічыць колькасць даследаванняў.

Сёння Гомельскі абласны анкадыспансер — адна з вядучых клінічных устаноў Г омельскай вобласці. Летась мясцовыя анколагі правялі абследаванне 11 700 чалавек. З новым камп'ютарным тамографам штогод тут змогуць праводзіць да 30 тысяч дыягностык.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**


**РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 26.03.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

Лот № 1. Земельный участок с кадастровым номером 323582003601000001 площадью 0,1000 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, Махновичский с/с, д. Зеленый Мох, ул. Луговая, 8, с расположенными на нем строительными материалами, вложенными в строительство деревянного дома. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. **Начальная цена продажи – 999,20 бел. руб., задаток – 99,92 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-79467, общей площадью 8,9 кв. м, год постройки – 1985, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Тамары Дутко, 2/5. Назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование: автозаправочный пункт. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030 площадью 4,4298 га. **Начальная цена продажи – 315 684,00 бел. руб., задаток – 31 568,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-26688, общей площадью 597,0 кв. м, год постройки – 2015, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, 142/3. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 221550100001003890 площадью 0,0484 га. **Начальная цена продажи – 113 310,00 бел. руб., задаток – 11 331,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

Лот № 4. Объект недвижимости в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения и земельного участка с кадастровым номером 625883504101000443 общей площадью 0,1450 га, расположенный по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Корзуны, 141. **Начальная цена продажи – 19 764,00 бел. руб., задаток – 1976,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-50774, общей площадью 100,1 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Добрушский р-н, г. Добруш, пр-т Луначарского, 11А. Назначение: здание специализированное розничной торговли, наименование: магазин «Запчастей». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000030 площадью 0,0312 га. **Начальная цена продажи – 38 250,00 бел. руб., задаток – 3825,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-149603, общей площадью 185,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, д. Обчак, ул. Мирная, 4. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623684109101000514 площадью 0,1473 га. **Начальная цена продажи – 140 400,00 бел. руб., задаток – 14 040,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Объект недвижимости в составе капитального строения с инвентарным номером 615/С-10433, общей площадью 67,8 кв. м и земельного участка с кадастровым номером 625883504101000096 общей площадью 0,2500 га, расположенного по адресу: Минская обл. Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Корзуны, ул. Минская, д. 21. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. **Начальная цена продажи – 50 940,00 бел. руб., задаток – 5 094,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Объект недвижимости в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624883000601000106, общей площадью 0,2499 га по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Багута. **Начальная цена продажи – 141 480,00 бел. руб., задаток – 14 148,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 123/С-891, общей площадью 944,5 кв. м, год постройки – 1989, расположенное по адресу: Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, ул. Первомайская, 149. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: здание цеха лесопиления. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 124350100001000593 площадью 1,1577 га. **Начальная цена продажи – 125 028,90 бел. руб., задаток — 12 502,89 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. **Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «недвижимость»**

**Аукцион состоится 26.03.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка **(задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, либо г. Минск, ул. Жилуновича, 15 (просьба уточнять адрес приема заявлений по указанным контактным телефонам), управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 23.03.2020 в 15.00.**

Задаток перечисляется на **р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002, г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 26 марта 2020 года.**

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента в любое время до объявления его проданным

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**

**ВНИМАНИЕ!**

В извещении о проведении 12.03.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, опубликованном в газете «Звязда» № 36 (29150) от 22.02.2020, начальную цену продажи лота № 15 читать 1667,52 бел. руб., задаток – 166,75 бел. руб.


# СМЯРОТНАЯ ЮШКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзе-нідзе ён нарастаў нават да васьмі сантыметраў, але тут жа да нас прыходзілі моцныя дажджы, тэмпература паветра ўпарта крочыла праз нуль у бок павышэння, а пасля ападкаў паветра месцамі саграваламі не па-зімоваму цёплае сонца. Вось так ад лёду і заставалася адна назва.

Па стане на 24 лютага ў краіне патанулі 29 чалавек, усе яны дарослыя. Адметна, што за паўтара месяца шэсць інцыдэнтаў звязана з лядовай абстаноўкай. Пяць з іх прыходзіцца на долю рыбакоў. Што адбылося 8 лютага на возеры Езярышча на крайнім паўночным усходзе Беларусі — так і не зразумела. Пакуль што вядома, што 59-гадовы мужчына нібыта выйшаў на лёд, каб праверыць яго трываласць. У выніку праваліўся і патануў.

Два трагічныя выпадкі адбыліся ў адзін дзень, 16 лютага, у Гомельскай вобласці. На возеры ў аграгарадку Вясёлка Веткаўскага раёна патануў 50-гадовы мужчына. На яшчэ адным возеры, але на гэты раз у вёсцы Старая Лутава Лоеўскага раёна, таксама падчас падлёднай рыбалкі загінуў яго равеснік.

Увогуле, Гомельшчына сёлета з вялікім адрывам вядзе ў гэтым сумным спісе. У Гомельскім раёне каля вёскі Асаўцы ёсць затон Сожа. 19 студзеня там рыбаліў 51-гадовы мужчына... У тым жа Гомельскім раёне 7 лютага рыбалка скончылася трагічна для 68-гадовага пенсіянера на возеры Гадзічава.

— Аднак да сапраўднай вясны яшчэ далекавата, і яшчэ не выключана, што тэмпература будзе «скакаць» праз нулявую адзнаку ў абодва бакі. Але такія ўмовы надвор'я вельмі неспрыяльныя для таго, каб сфармавалася трывалае лядовае пакрыццё. Каб яно магло трымаць вагу чалавека, патрэбна стабільна адмоўная тэмпература як удзень, так і ўначы. І больш за тое, такія ўмовы павінны быць на працягу тыдня. Інакш калі лядовае пакрыцце і пачне фармавацца, то яно будзе чыста сімвалічным, маючы пры гэтым порыстую структуру, поласці ў якой будуць запоўнены вадой.

Тэмпература вады цяпер у вадаёмах — ад 3 да 4 градусаў цяпла. Чалавек у такіх умовах можа знаходзіцца не больш за 5 хвілін. Далей ён замярзае і не можа больш рухацца.

Паказальны выпадак адбыўся 15 лютага ў Сенненскім раёне. На лёд адправіліся два рыбакі. Адзін з іх праваліўся і пачаў тануць. Яго напарнік убачыў гэта, тут жа патэлефанаваў па нумары 102. Міліцыянеры перадалі інфармацыю ратаўнікам. Рыбак, пакуль тыя ехалі, трымаў свайго таварыша за рукі некалькі хвілін, каб ён не сышоў пад ваду.

— Пры гэтым калі вы бачыце, што чалавек церпіць бедства, то лепш не ўваходзіць з ім у прамы кантакт, калі ў вас няма адпаведных навыкаў, — раіць Алег Баразна. — Трэба працягнуць яму кій, вяроўку, куртку ці нейкі іншы трывалы прадмет. Справа вось у чым. Чалавек, які тоне, як вядома з прымаўкі, хапаецца за саломінку. І можа зацягнуць за сабой і свайго памочніка.

З 1 студзеня ў Беларусі на вадзе выратавана больш за 10 чалавек, з іх трое непаўналетніх. А вось летась за гэты час было ўсяго толькі пяць загінулых. Чаму ж адбыўся такі імклівы рост — з 5 да 22? Справа ў тым, што ў нас вельмі шмат выпадкаў звязаны з неспадзяванымі падзеннямі ў ваду. Летась лёд быў больш-менш трывалы. Калі чалавек гуляе ўздоўж вадаёма, магчыма, і не зусім цвярозы, і падае ўніз, аступіўшыся, то рукі-ногі ён, можа, і паламае, але застанецца жывы. Пры падзенні ў глухім месцы і асабліва аднаму варыянтаў амаль не застаецца.

Тут трэба згадаць недарэчны інцыдэнт у Акцябрскім раёне. 63-гадовы мужчына са сваім сабакам гуляў па беразе ракі Нератоўка. Глыбіня ракі ў тым месцы зусім невялікая — 60 сантыметраў. Ды і шырыня не сказаць каб вялікая — шэсць метраў. Але гэтага хапіла, каб пенсіянер не змог выбрацца з ледзяной вады і патануў...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ДАРОГАМІ СЛАВЫ

## ЛЕГЕНДЫ ПЕРАМОГІ

Трыццаць гадоў таму, калі я толькі пачаў працаваць у адной з рэспубліканскіх газет, распачаў серыю пра знакамітых землякоў і ў тым ліку стаў шукаць і здымаць поўных кавалераў ордэна Славы — ураджэнцаў Беларусі, якія ў той час жылі і працавалі на радзіме — у маленькіх вёсачках, раённых і абласных гарадах. Мяне вабіла тэма нашых абаронцаў-франтавікоў — пехацінцаў, сапёраў, разведчыкаў, кулямётчыкаў, артылерыстаў, сувязістаў — якія першымі сустракалі варожы агонь, першымі ішлі на нямецкія акопы. Адважныя, храбрыя, яны вызвалялі нашу Радзіму, вызвалялі Еўропу. Лепшых прыкладаў для абранай тэмы, як гэтыя простыя салдаты вайны, і прыдумаць нельга было! Поўныя кавалеры салдацкай Славы не проста мужныя людзі — усе яны тройчы пабывалі на грані жыцця і смерці.

Сярэдзіна дзевяностых мінулага стагоддзя. Я шкадаваў, што позна адкрыў для сябе гэту высакародную тэму, таму што з усяго спіса (у якім налічваецца семдзесят ардэнаносцаў) у жывых заставалася зусім не шмат — толькі дваццаць пяць чалавек. Шкадаваў і радаваўся, бо ў маёй партрэтнай калекцыі зоймуць месца фатаграфіі сапраўдных легенд Перамогі. І я спяшаўся на сустрэчы: многім з іх было на той час за восемдзесят гадоў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

## Аніс КЛОПАЎ

Аніс Андрэевіч Клопаў нарадзіўся ў вёсцы Наваселле Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў маі 1914 года. У Чырвоную Армію трапіў у 1938-м. Аніс Клопаў прайшоў усю вайну — ваяваў усе 1418 дзён. Змагаўся ён на чатырох франтах — Заходнім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім і 3-м Беларускім. Падраздзяленні, у якіх праходзіў службу, бралі ўдзел у вызваленні Літвы і Беларусі.

Малодшы сяржант Аніс Клопаў даслужыўся да камандзіра сапёрнага аддзялення. Спярша ён быў пехацінцам, пасля яго перавялі ў 4-ю асобную штурмавую брыгаду рэзерву галоўнага камандавання. 20-ы інжынерна-штурмавы сапёрны батальён, у які трапіў Аніс Андрэевіч, шчыраваў на тэрыторыі Усходняй Прусіі. Гэтае падраздзяленне лічылася вельмі кваліфікаваным, і таму яно заўжды задзейнічалася ў самых складаных сітуацыях.

Шлях да поўнага кавалера ордэна Славы заняў у малодшага сяржанта Клопава тры месяцы 1945 года. У пачатку студзеня ён размініраваўміннае поле шырынёй у 40 метраў паблізу населенага пункта Дрэвенінгкен (цяпер горад Несцераў Калінінградскай вобласці Расіі). За гэта быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Крыху больш чым праз месяц ён адным з першых фарсіраваў раку Штрадзік у баях за населены пункт Вангнікен (цяпер — пасёлак Еніна). Дзякуючы яго прыцэльнаму агню з кулямёта нямецкія войскі не далічыліся 20 чалавек. Пасля ў ліку першых Аніс Клопаў пераправіўся праз раку і захапіў у палон на назіральным пункце двух салдат ворага. Гэты подзвіг стаў падставай узнагародзіць яго ордэнам II ступені.



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**...6 красавіка каля Кёнігсберга савецкія войскі прарвалі абарону немцаў. Міннае поле, загадзя імі падрыхтаванае, не стала перашкодай для Аніса Клопава. Ён зрабіў там праход, па якім і ўварваўся ў траншэі ворага, дзе скасіў прыцэльным агнём трынаццаць гітлераўцаў. Варожая куля зачапіла і малодшага сяржанта Клопава, але месца бою ён не пакінуў.**

Аніс Клопаў паўдзельнічаў і ў знакамітым Парадзе Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года. А вось чарговая ўзнагарода чакала яго доўга. Толькі ў маі 1946 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў яго ордэнам Славы I ступені.

Толькі праз восем гадоў пасля дэмабілізацыі Аніс Андрэевіч вярнуўся на сваю радзіму. Ва Ушачах ён спачатку працаваў у міліцыі, пасля на прамысловым камбінаце. Памёр у пачатку лютага 1995 года.

## Уладзімір МОТУЗ

На момант пачатку вайны яму споўнілася ўсяго сямнаццаць гадоў. Хлопец вучыўся ў рамесніцкім вучылішчы ў Ленінградзе. Там жа ён перажыў і першую блакадную зіму. Знясіленага хлопца вывезлі па Дарозе жыцця. Ён трапіў далёка ў тыл — у Куйбышаў. Як толькі ўстаў на ногі — папрасіўся на фронт...



У баявую часць Уладзімір трапіў у 1943 годзе. З восені служыў у 1037-м стралковым палку 223-й стралковай дывізіі. У паслужным спісе — баі на Паўднёва-Заходнім, 2-м і 3-м Украінскім франтах.

З 15 кастрычніка па 23 лістапада 1943-га войскі 2-га Украінскага фронту праводзілі Пяціхацкую наступальную аперацыю. Мэтай савецкіх войскаў было вяртанне Крывога Рога. Але прабіцца да горада нашым часцям не ўдалося, паколькі яны сустрэлі жорсткае супраціўленне. У выніку яны перайшлі да суцэльнай абароны. І 223-я стралковая дывізія заняла пазіцыі на беразе ракі Інгулец. Але разам з тым яна перашкаджала немцам замацавацца на тактычна выгадных вышынях, адбіваючы контратакі і вяртаючы пад свой кантроль некаторыя паселішчы. Так, у баі, які адбыўся 14 лістапада каля сяла Багданаўка, што размешчана ў Пятроўскім раёне Кіраваградскай вобласці, Уладзімір Мотуз першым уварваўся ў размяшчэнне немцаў і вёў па іх прыцэльны аўтаматны агонь. Паказаны ім прыклад заахвоціў байцоў, і яны неўзабаве занялі сяло. Уладзімір Мотуз вярнуўся з нядрэнным уловам — ён захапіў «языка» з каштоўнымі сакрэтнымі дакументамі. Гэта стала нагодай для ўзнагароджання ордэнам Славы III ступені.

Неўзабаве Уладзімір Мотуз папрасіўся перайсці ў палкавую разведку. Просьбу задаволілі. Баец зарэкамендаваў сябе з самага лепшага боку. У групе захопу ціха падпоўз да варожых траншэй і закідаў іх гранатамі. Пасля замяніў цяжка параненага падчас адной з аперацый па захопе «языка» камандзіра. Быў яшчэ шэраг вельмі адказных заданняў. А ордэн Славы II ступені ён атрымаў не так хутка. Напрыканцы жніўня 1944 года падчас Яска-Кішынёўскай наступальнай аперацыі войскі 3-га Украінскага фронту пачалі Кішынёўска-Ізмаільскую аперацыю, мэтай якой было імклівае вызваленне тэрыторыі Малдовы. Падчас наступлення на сяло Танатары сяржант Мотуз падпоўз да варожага агнявога пункта і закідаў яго гранатамі. Дзякуючы гэтаму нашы войскі і авалодалі сялом.

**...Сакавік 1945 года Уладзімір Мотуз сустрэў у цяжкіх баях у Венгрыі. Ішла Венская наступальная аперацыя.**
**У складзе разведвальнай групы сяржант Мотуз зайшоў у вёску Варгестэш. Там ён знішчыў агнявы пункт, які перашкаджаў савецкаму наступу, і захапіў у палон двух ворагаў. Падчас бою за вёску Вертэшомла разведвальная група перарэзала кабель сувязі, захапіла кулямёт і склад з боепрыпасамі. За гэты подзвіг Уладзімір Мотуз быў прадстаўлены да ордэна Славы I ступені.**

Дэмабілізаваўся ў 1950 годзе і пераехаў у Мінск. Спачатку працаваў на дрэваапрацоўчым камбінаце, пасля пераехаў на радзіму ў Петрыкаўскі раён, дзе шчыраваў на ніве механізацыі сельскай гаспадаркі раёна. Памёр у 1996 годзе.

## Пётр БАНДАРЧУК

Пакручасты баявы шлях Пятра Бандарчука пачаўся даволі позна — у 33 гады. Але нічога дзіўнага ў гэтым няма. Пётр Хведаравіч нарадзіўся і жыў у вёсцы Забароўцы Пінскага раёна. З-за блізкасці гэтай мясцовасці да тагачаснай заходняй мяжы СССР родная вёска трапіла пад акупацыю немцамі літаральна ў першыя дні. Так наш герой і застаўся на акупаванай тэрыторыі.

...Праз тры гады, у жніўні 1944-га, яго прызваў на службу мясцовы райваенкамат. Увесь франтавы шлях Пятра Хведаравіча непарыўна звязаны з 275-м стралковым палком 117-й стралковай дывізіі на 1-м Беларускім фронце. Ён прымаў удзел у цяжкіх баях за Познань у лютым 1945 года. Вялікая групіроўка вермахта была ўзята ў кацёл. Пры гэтым сама Познань была істотным цэнтрам стратэгічнай абароны нацыстаў. У гэтых баях ён заслужыў два ордэны Славы. Пры захопе плацдарма на рацэ Вісла кулямётчык двое сутак адбіваўся ад немцаў, чакаючы, пакуль падыдуць асноўныя сілы батальёна. 21 лютага 1945 года камандзір 117-й стралковай дывізіі Ермалай Кабярыдзэ асабіста ўручыў радавому Бандарчуку ордэн Славы III ступені. І адразу ж — у новы бой...

**Падчас баёў за Познань у канцы лютага 1945 года разам з напарнікам ён авалодаў апорным пунктам немцаў, дзе знішчыў сем ворагаў. А пасля ў баі замяніў раненага камандзіра і ўзяў кіраванне падраздзяленнем на сябе, дзякуючы чаму праціўнік не здолеў вырвацца з акружэння. На жаль, дзве пачэсныя ўзнагароды — ордэны Славы II і I ступені — Пётр Хведаравіч атрымаў толькі пасля вайны. Прычынай таго, што на гэта сышло два і дзесяць гадоў адпаведна, стала памылка ў дакументах, якую ўдалося выправіць далёка не адразу. Атрымалася, што Пётр Бандарчук быў узнагароджаны ажно трыма ордэнамі Славы III ступені.**



І толькі ў 1955 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прызнаў памылку і адмяніў два ўказы аб узнагароджанні, датаваныя 1945 і 1947 гадамі. Замест двух ордэнаў Славы III ступені ён атрымаў узнагароды II і I ступені. Так і стаў поўным кавалерам.

Пасля вайны Пётр Хведаравіч вярнуўся да сябе на радзіму на Палессе. Быў цесляром у калгасе. Памёр у 1996-м годзе.

## Міхей МІНЧАНКАЎ

Пераўзнагароджанне закранула і нашага апошняга на сёння героя. Праўда, адбылося яно ажно ў 1966 годзе. Але аб усім па парадку.

Міхей Мітрафанавіч нарадзіўся ў Мсціслаўскім раёне ў 1913-м годзе. На фронт трапіў, калі яму споўнілася трыццаць гадоў. Служыў у 297-м стралковым палку на 3-м Беларускім фронце. У жніўні 1944-га разам з іншымі байцамі адбіў некалькі контратак ворага каля літоўскай вёскі Блюдш і ўтрымаў займаны ім



рубеж, пакуль не падышло папаўненне. Дзякуючы прыцэльнаму агню гітлераўцы не далічыліся ў сваіх шэрагах пятнаццаць салдат і аднаго афіцэра. Ордэн Славы III ступені Міхей Мінчанкаў атрымаў літаральна праз два тыдні.

Наступную ўзнагароду наш герой здабыў таксама на тэрыторыі Літвы. У кастрычніку 1944-га, калі савецкія войскі адбівалі адну за другуюй нямецкія контратакі каля мястэчка Наўямесціс, ён непрыкметна прабраўся ў фланг ворага і пачаў прыцэльную страляніну па акупантах. Шэсць гітлераўцаў былі забіты адразу, яшчэ адзінаццаць тут жа здаліся ў палон. Ордэн Славы II ступені знайшоў яго толькі праз тры месяцы.

**Падобны манеўр Міхей Мітрафанавіч ажыццявіў ва Усходняй Прусіі 17 красавіка 1945-га, калі баі ішлі на подступах да Кёнігсберга. У гэты час ён ужо быў камандзірам стралковага аддзялення 9-га гвардзейскага стралковага палка, меў званне сяржанта. Падчас адбіцця чарговай контратакі ён зайшоў з падначаленымі байцамі ў тыл ворага і раптам адкрыў агонь. Гэта паспрыяла таму, што контратака была тут жа згорнута.**

За гэты ўчынак Міхей Мітрафанавіч быў паўторна ўзнагароджаны ордэнам Славы II ступені. Агулам жа час вайны варожыя кулі яго насцігалі тройчы. Але і сам ён паставіў кропку ў жыцці 125 гітлераўцаў. Пасля вайны вярнуўся на радзіму, працаваў і жыў у Мсціславе.

І толькі 24 кастрычніка 1966 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР гвардыі старшына запасу Міхей Мінчанкаў быў пераўзнагароджаны ордэнам Славы I ступені. Так ён і стаў поўным кавалерам. Пражыў ён у гэтым званні амаль 37 гадоў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

---

Сітуацыя

# НАВУКА ЦЫВІЛІЗАВАНАГА ГАНДЛЮ

## Як прадаць, не парушаючы закон

**«Мааам, купі мне сабачку, ну калі ласка!» — енчыць дачка ў адным з мінскіх падземных пераходаў. Я паглядзела на цацку, якая цяўкала і рабіла няўклюдныя спробы хадзіць па кардонцы, што ляжала на падлозе. У пачатку 2000-х я ўжо набывала такую ж для старэйшай дачкі. Малая гуляла з цацкай не больш за суткі. Потым тая перастала рухацца і цяўкаць, а замена батарэек не змагла вярнуць «сабачку» да жыцця. Памятаю, як доўга супакойвала дачку... Цяпер жа мне не хацелася плаціць 10 рублёў за рэч, якая на наступны дзень стане смеццем.**

**«Можа, давай што-небудзь іншае набудзем і лепш у краме?» — прапанавала дачцэ. Але малая пабегла ўздоўж шэрагу гандлюючых — у надзеі, што я ўсё ж дазволю ёй нешта выбраць. У пераходзе размясціўся сапраўдны міні-рынак, толькі тавар ляжаў часцей за ўсё на падлозе на кардонках, поліэтылене ці проста пажоўклых газетах. У продажы — зубная паста, кава, гарбата, прыправа, зяленіва, яйкі, квашаная капуста і тут жа — вязаныя шкарпэткі, вусцілкі для абутку і букеты кветак. Ці магчыма ўсё гэта багацце прадаць людзям не з «зямлі», а больш цывілізавана? Па адказ карэспандэнт газеты «Звязда» звярнулася ў галоўнае ўпраўленне гандлю і паслуг Мінгарвыканкама.**

### Наблізіцца да цывілізацыі

Быў час, калі людзі, якія гандлявалі ў пераходах, «ставілі» на выхадзе з перахода чалавека, які папярэджваў аб набліжэнні міліцыянераў. Людзі хутка збіралі тавар і беглі адтуль. Цяпер такога хуткага збору тавару прадаўцамі не ўбачыш, а міліцыянеры спакойна праходзяць міма.

«Несанкцыянаваны гандаль асабліва актыўна стаў развівацца з 2013 года, калі органы ўнутраных спраў былі пазбаўлены правоў на складанне пратаколаў за гандаль у неўстаноўленых месцах, — тлумачыць **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА.** — Мінгарвыканкам неаднаразова прапаноўваў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь унесці змены ў заканадаўства, каб пашырыць кола асоб, упаўнаважаных складаць адміністрацыйныя пратаколы, і ўзмацніць меры адказнасці за ажыццяўленне несанкцыянаванага гандлю».

Аднак падтрымку ў дадзеным пытанні Мінгарвыканкам не атрымаў. Для пашырэння кола асоб, якія павінны вырашаць праблемы несанкцыянаванага гандлю, у тым ліку ў частцы парушэння парадку ўтрымання гарадскіх тэрыторый, унесены дапаўненні ў Правілы добраўпарадкавання і ўтрымання горада Мінска, зацверджаныя рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў у 2016 годзе. Парушэнне патрабаванняў Правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, цягне накладанне штрафу. Паўнамоцтвамі на складанне пратаколаў надзелены службовыя





асобы ўпраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама, камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама і галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама.

У прынцыпе, у самім гандлі няма нічога супрацьзаконнага. Галоўнае — рабіць гэта больш-менш цывілізавана.



Як патлумачыла спецыяліст Мінгарвыканкама, фізічныя асобы, самастойна — без прыцягнення іншых фізічных асоб па працоўных і (або) грамадзянска-прававых дагаворах — маюць права ажыццяўляць дзейнасць па рэалізацыі вырабленых гэтымі фізічнымі асобамі плодаагародніннай прадукцыі, хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў, гатовай кулінарнай прадукцыі, а таксама створаных імі твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў; прадукцыі кветкаводства, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады, жывёл (за выключэннем кацянят і шчанюкоў); лекавых дзікарослых раслін, ягад, грыбоў, арэхаў і іншых. Што датычыцца дэкаратыўных раслін і прадукцыі кветкаводства, то імі лічацца кветкі — зрэзаныя і ў вазонах, — расада кветак, насенне і цыбуліны раслін, саджанцы дрэў і кустоў, калядныя ёлкі, зрэзаныя галінкі шматгадовых кустоў і дрэў, часткі раслін, травы, імхі і лішайнікі, якія выкарыстоўваюцца для дэкаратыўных мэт і якія таксама можна законна прадаваць фізічным асобам.

### Ёсць магчымасці, але...

Фізічным асобам прадстаўлена права рэалізоўваць тавары на кірмашах і спецыяльных гандлёвых месцах на рынках. Гандаль у іншых месцах лічыцца незаконным.

Колькасць месцаў на рынках неабмежавана — яшчэ ніводнага чалавека не адправілі на вуліцу. Кіраўніцтва рынкаў заўсёды адшуквае магчымасці падставіць столікі і вылучыць дадатковыя месцы. Дзякуючы гэтаму ў сезон — у выхадныя, летам і восенню, калі асабліва вялікі попыт на свежыя гародніну і садавіну, — да тысячы чалавек можа адначасова прыйсці на рынкі горада з лішкамі свайго ўраджаю.

«Мінгарвыканкам многія гады заключае дамовы з рынкамі Мінска, — расказвае Ніна Емяльянава. — Пенсіянерам і іншым ільготным катэгорыям грамадзян даюць месца для гандлю прадукцыяй, вырашчанай на сваіх участках, на бязвыплатнай аснове. І ўсе ідуць нам насустрач. На сёння мы падпісалі пагадненні з 15 рынкамі. Усяго, дарэчы, у нас 16 універсальных рынкаў, і толькі адзін з іх не падпісвае пагадненне, але сваім загадам усталёўвае такія месцы і перадае нам копію загаду, каб мы валодалі інфармацыяй. Даведацца аб наяўнасці месцаў можна на сайтах рынкаў або па тэлефоне. Законапаслухмяныя грамадзяне заўсёды знаходзяць гэтыя звесткі і ідуць гандляваць туды».

Праўда, трэба памятаць пра адну ўмову: каб выключыць вядзенне прадпрымальніцкай дзейнасці на рынках без выплаты падаткаў і арэнды, за адзін раз можна прадаць да 20 кілаграмаў прадукцыі. Дарэчы, надвор'е дазваляе гандляваць на вуліцы і цяпер. Бо калі менш за нуль градусаў, плодаагародніннуюпрадукцыю на вуліцы прадаваць нельга. Раней Мінгарвыканкам заключаў дамовы з рынкамі на прадастаўленне дадатковых месцаў са жніўня па снежань, цяпер жа пагадненне будзе дзейнічаць цэлы год. Пенсіянерам гэта толькі на руку, бо было, што яны не паспявалі рэалізаваць да канца лістапада тыя ж яблыкі або бульбу. У Мінгарвыканкаме звароты людзей пачулі.

А вось гандаль з аўтамабіляў, які часта адбываецца каля шматпавярховак і на прыпынках грамадскага транспарту, з'яўляецца незаконным. Адказнасць за такую прадпрымальніцкую дзейнасць прадугледжана часткай 8 і часткай 10 артыкула 12.17 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях. Памер адміністрацыйных штрафаў можа дасягаць да пяцідзесяці базавых велічынь.

### Заплаці і спі спакойна

Фізічныя асобы, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, выплачваюць адзіны падатак пры рэалізацыі названых вышэй тавараў на гандлёвых месцах на рынках і кірмашах. Лепей, вядома, да дня пачатку дзейнасці падаць у падатковы орган пісьмовае паведамленне або апавяшчэнне праз асабісты кабінет плацельшчыка з указаннем відаў дзейнасці, якія яны збіраюцца ажыццяўляць, відаў тавараў, формаў аказання паслуг, а таксама перыяду і месца ажыццяўлення дзейнасці. Падатковыя органы ў кожным канкрэтным выпадку раскажуць пра суму належнага да выплаты падатку.

Цывілізавана гандляваць у краіне магчыма, і гэта зусім нескладана. І кожны прадавец вырашае для сябе сам, зарабляць законна ці гандляваць, баючыся атрымаць штраф за продаж з «зямлі». Але несанкцыянаваны гандаль падтрымліваюць не толькі прадаўцы, але і самі пакупнікі.

«Мне пасля працы, напрыклад, зусім не хочацца ісці ў краму і стаяць у чарзе ў касу. А тут выйшла з метро, набыла вусцілкі для дзіцяці, пакеты для сняданкаў, зяленіва, прычым танней, чым у краме і хуценька дадому», — прызнаецца адна з такіх пакупнікоў у пераходзе. Выходзіць, што такі гандаль у краіне выкараніць пакуль немагчыма, бо калі ёсць попыт — будзе і прапанова. Калі ўсё ж чалавек вырашае набыць тавар, які прадаюць незаконна, то ён павінен усведамляць, што такія пакупкі не трапляюць пад дзеянне Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», і таму пакупнік застаецца безабаронным перад нядобрасумленнымі прадаўцамі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**



Святлана ШЫЦЬКО — эканаміст па збыце.

# ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ КУДЫ РУХАЦЦА ДАЛЕЙ

## Такое крэда дырэктара Нясвіжскага завода медпрэпаратаў Генадзія ЖЫВЕНЯ. Гэтых прынцыпаў прытрымліваецца і калектыў

**Нясвіжскаму заводу медыцынскіх прэпаратаў сёлета спаўняецца 60 гадоў. Юбілей тут плануюць адзначыць восенню. Вядома ж, будуць і віншаванні, і ўзнагароджанне найлепшых работнікаў, ветэранаў, якія аддалі прадпрыемству шмат гадоў. Прыедуць на свята і шматлікія калегі, госці, каб падзяліць агульную радасць з калектывам прадпрыемства.**

**А пачыналася ўсё ў далёкім 1960-м на базе Альбянскага спіртавога завода, створанага на пабудовах, што належалі князям Радзівілам. Да 1992 года тут выпускалі кармавы антыбіётык хлортэтрацыклін (біяміцын) для ветэрынарыі, экалагічна чыстае ўгнаенне рызатарфін, біякансервант біясіл і лекавы прэпарат Баліз-2. У 1992-м было праведзена тэхнічнае пераўзбраенне і створана вытворчасць па выпуску салявых раствораў.**

### Крочыць у нагу з сусветнымі вытворцамі

У 2016 годзе дырэктарам завода прызначылі Генадзія Жывеня. Генадзій Адольфавіч, можна сказаць, свой, тутэйшы. Нарадзіўся ў пасёлку Сноў Нясвіжскага раёна. Як кажуць, дзе нарадзіўся, там і згадзіўся. Ён узяў усё найлепшае ад сваіх папярэднікаў, якія раней кіравалі заводам, захаваў набыткі і прымножыў іх. І, вядома, прыўнёс у работу новыя ідэі, напрацоўкі. У выніку значна палепшыліся паказчыкі фінансава-эканамічнай дзейнасці.

— На сённяшні дзень наш завод з'яўляецца лідарам па выпуску інфузійных раствораў у Беларусі. У асартыменце іх больш за 37 найменняў, а з улікам дазіроўкі формаў выпуску колькасць відаў прадукцыі перавышае 105. Да таго ж мы працуем з некалькімі вядомымі ў свеце кампаніямі па балк-прадукце, у перакладзе з англійскай мовы — нерасфасаваным гатовым прадукце. Інакш кажучы, сюды дастаўляем таблеткі, упакоўваем іх, праводзім кантроль якасці і запускаем на рынак. Такіх прадуктаў ужо ёсць некалькі, і ў гэтым кірунку рухаемся далей. Што датычыцца інфузійных раствораў, то ў нас асвоены ўвесь іх спектр, які выпускаюць сусветныя фармацэўтычныя кампаніі. На заводзе ствараюцца і новыя інавацыйныя растворы. Свайго навуковага падраздзялення ў нас няма, але ў склад нашага холдынгу ўваходзіць Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр ЛОЦІОС». Тут працуюць тэарэтыкі-распрацоўшчыкі, а мы, практыкі, укараняем распрацоўкі ў вытворчасць. У распрацоўцы і інавацыйны прадукт, уключаны ў Рэспубліканскую праграму развіцця фармацэўтычнай галіны, — расказаў дырэктар.

Актыўнае развіццё фармацэўтычнай прамысловасці ў XXI стагоддзі прымушае вытворцаў уважліва сачыць за апошнімі тэндэнцыямі ў галіне, укараняць найноўшыя тэхналогіі, выкарыстоўваць сучаснае абсталяванне. Таму працэс мадэрнізацыі асабістай вытворчасці на заводзе — гэта бесперапынны працэс. У прыватнасці, у 2008 годзе тут рэалізаваны праект па стварэнні лініі вытворчасці інфузійных раствораў па тэхналогіі BFS (выдзьмуванне — напаўненне — запайванне), які дазволіў пашырыць асартымент. Новы цэх пабудаваны і аснашчаны сучасным абсталяваннем вядомых вытворцаў з Германіі, Італіі, Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта такія прызнаныя лідары на рынку абсталявання для фармацэўтычнай прамысловасці, як Weiler, Pharmatec, Fedegari Group.

У 2014-м на прадпрыемстве створаны ўчастак па выпуску інфузійных раствораў у палімерных кантэйнерах. У 2016-м мадэрнізавана лінія па разліве інфузійных раствораў у шкляныя бутэлькі. Усе ўчасткі па вытворчасці лекавых сродкаў адпавядаюць патрабаванням «Належнай вытворчай практыкі» (GMP).

У 2019-м пачаў дзейнічаць склад сыравіны і матэрыялаў, які адпавядае ўсім неабходным патрабаванням і атэставаны. Хутка на заводзе будзе ўведзена ў эксплуатацыю новая мікрабіялагічная лабараторыя. Пачалася таксама мадэрнізацыя хімічнай лабараторыі. У планах — да канца года запраектаваць фармакалагічную лабараторыю. Цяпер яна знаходзіцца ў старым будынку. Таму на прадпрыемстве пакуль не адмаўляюцца ад выпрабавання новай прадукцыі на дробных жывёлах. Цяпер жа тэндэнцыя ў свеце такая, што фармацэўтычная прамысловасць пераходзіць на так званыя ЛАЛ-тэсты.

### Гарантуе «мясцовая канстытуцыя»

На сённяшні дзень практычна цалкам укамплектаваныя ўсе пасады. Ёсць пэўныя праблемы па спецыфічных спецыяльнасцях, такіх як тэхнолагі, хімікі. Але яны цалкам вырашальныя.

— У нас вялікая чарга на працаўладкаванне рабочых. Мы вымушаны апошнім часам адмаўляць людзям на запіс у чаргу, таму што гэта нерэальна. Выбіраем рабочых толькі з дэфіцытнай спецыяльнасцю і з высокай кваліфікацыяй. Іх навучанне праводзім самі з выдачай адпаведных сертыфікатаў. Тэхналагічны персанал пастаянна павышае кваліфікацыю. Імкнёмся не прапускаць ніводнага семінара, вучобы, якія праводзяцца па нашым профілі. Сусветная фармацэўтычная галіна рухаецца наперад вялікімі крокамі, і мы не можам дазволіць сабе адставаць, — адзначае Генадзій Адольфавіч.



Генадзій ЖЫВЕНЬ, дырэктар ААТ «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў».

Прадукцыйнасць працы, вядома ж, залежыць і ад тых умоў, у якіх працуе чалавек, ад таго, як ён адпачывае. Гэта добра разумеюць кіраўніцтва завода і прафсаюз. Шмат увагі яны ўдзяляюць бытавым пытанням. На балансе прадпрыемства два інтэрнаты. У тым, што побач, правялі мадэрнізацыю, замянілі праводку, сантэхнічнае і кухоннае абсталяванне, дах, вокны, уцяплілі сцены будынка. У пяціпавярховым інтэрнаце, што ў горадзе, уладкавалі кухні, пакой для сушкі бялізны. Цяпер мяняюць камунікацыі. Так што ёсць дзе жыць тым, хто не мае ва ўласнасці кватэры. Сюды ж засяляюць і маладых спецыялістаў. Гэта дапамагае замацоўваць іх на заводзе пасля абавязковага тэрміну адпрацоўкі. За пяць гадоў у калектыў прыйшло каля 13 маладых спецыялістаў, а звольнілася дзесьці два-тры, і то па ўважлівых сямейных прычынах. Ды і ў цэлым цякучасць кадраў мінімальная. Задавальняе і зарплата — сярэдняя на прадпрыемстве за мінулы год 1077 рублёў, для раённага гарадка — нядрэнна.


Вольга КАСАПАЛІКАВА, начальнік участка падрыхтоўкі разліву і стэрылізацыі; Антаніна СУДНІК, Святлана ГАЦІЛА — машыністкі расфасовачна-ўпаковачных машын. Упакоўка лекавых сродкаў у шкляных бутэльках, на дадзены момант «Соданат» — для Рэспублікі Азербайджан.

— У арганізацыі дзейнічае калектыўны дагавор. Ён прадугледжвае дадатковыя, у параўнанні з дзеючым заканадаўствам, палажэнні аб умовах працы і яе аплаце, сацыяльным і жыллёва-бытавым забеспячэнні работнікаў, гарантыі і кампенсацыі, якія дае наймальнік. Значная ўвага ў «мясцовай канстытуцыі» ўдзяляецца моладзі. У прыватнасці, пры згодзе маладога спецыяліста на працяг работы пасля заканчэння тэрміну размеркавання, па прадстаўленні кіраўнікоў структурнага падраздзялення, яго аклад павялічваецца на 10 %. Маці, якая выхоўвае двух і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, па яе заяве штомесяц даецца адзін свабодны ад работы дзень з аплатай у памеры 50 % базавай велічыні, — канстатуе **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Марына ЯРАШ.**

Асобным раздзелам прадугледжаны кампенсацыі для ўсіх катэгорый работнікаў. За 2019 год са сродкаў арганізацыі на аказанне матэрыяльнай дапамогі ў сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам выдзелена 2295, на аздараўленне — 44 400, на аздараўленне да працоўнага адпачынку —131 947 рублёў. Выплаты даюцца жанчынам, якім споўнілася 50 і 55 гадоў, мужчынам — пры дасягненні 60 гадоў. Не забываюць і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых работнікаў, а таксама пенсіянераў. Летась ім аказана дапамога да Дня пажылых людзей са сродкаў арганізацыі ў памеры 9129 рублёў. Выплаты прызначаны і тым, хто ўпершыню ўступіў у шлюб, у каго нарадзілася дзіця. Бацькі атрымліваюць дапамогу на падрыхтоўку сваіх выхаванцаў да новага вучэбнага года і на дзяцей, якія ідуць у першы клас. Матэрыяльная дапамога даецца таксама работнікам, якія працяглы час знаходзяцца на лячэнні — 25 і больш каляндарных дзён: яна складае тры базавыя велічыні за кожны перыяд хваробы. Асобам, якія набываюць пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне, дапамога выплачваецца са сродкаў наймальніка і прафсаюза.


Людміла ІГНАТЧЫК займаецца пакаваннем бутэлек для разліву лекавых сродкаў.

Усяго ж на заводзе працуе больш за 400 супрацоўнікаў, кожны з якіх добрасумленна выконвае свае абавязкі. Вялікі плюс, што на завод актыўна бяруць моладзь. Гэта дазваляе абнаўляць кадравы склад і ўносіць свежыя ідэі.

Дырэктар цэніць кожнага супрацоўніка, што з'яўляецца гарантыяй росквіту прадпрыемства. Крэда Генадзія Адольфавіча — «Няма мяжы ўдасканаленню» і «Заўсёды ёсць куды рухацца далей». Гэтых прынцыпаў калектыў і прытрымліваецца, пра што сведчаць шматлікія ўзнагароды: граматы, дыпломы. У прыватнасці, у лістападзе мінулага года ў Мінску адбылася цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў першай бізнес-прэміі «Кіраўнік года — 2019. Эліта нацыянальнай эканомікі». Лаўрэатам бізнес-прэміі стала і адкрытае акцыянернае таварыства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» у асобе яго дырэктара Генадзія Жывеня.

Завод таксама ўладальнік гран-пры конкурсу «Прадукт года — 2018» у намінацыі «Медыцынскія прэпараты»: «За вытворчасць лекавых прэпаратаў: стэрыльныя інфузійныя і ін'екцыйныя растворы, растворы для вонкавага прымянення». Прадпрыемства трапіла ў лік пераможцаў конкурсу Мінскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» «Найлепшае прадпрыемства для працуючай мамы».


Таццяна ЮРКО і Алена УРУБЛЕЎСКАЯ — машыністы па мыцці і рамонце спецадзення.


Аляксандр БЯЖОК, майстар участка гама-ўстаноўкі. Ён кантралюе працэс стэрылізацыі альбуміну з дапамогай гама-ўстаноўкі. Таксама завод вырабляе стэрылізацыю бінтоў, касметычнай сыравіны, тэрмаўсадачных вырабаў.


Начальнік цэха медыцынскіх прэпаратаў і іншай прадукцыі Зоя КУЗНЯЦОВА. На ўчастку водападрыхтоўкі, дзе адбываецца атрыманне вады вычышчанай і вады для ін'екцый, якія служаць для далейшага атрымання лекавых сродкаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**
УНП 200274520.

### Кантроль і яшчэ раз кантроль

Якасці прадукцыі на Нясвіжскім заводзе медпрэпаратаў удзяляецца асаблівая ўвага. Гэтым займаецца аддзел кантролю якасці, куды ўваходзяць хімічная, мікрабіялагічная і фармакалагічная лабараторыі. Акрамя таго, дзейнічае і выпрабавальная лабараторыя. Аддзел ажыццяўляе кантроль на ўсіх этапах тэхналагічнага працэсу вытворчасці інфузійных раствораў, у тым ліку кантроль тэхналагічнай дысцыпліны, якасці гатовых лекавых сродкаў, умоў іх захоўвання. Усе лабараторыі акрэдытаваны, маюць права рабіць аналізы не толькі для сябе. Сюды паступаюць і заказы з іншых арганізацый на пэўныя віды даследаванняў, якія праводзяць спецыяльна падрыхтаваныя спецыялісты, ёсць неабходныя прыборы.

Што датычыцца ў цэлым абсталявання, то яно ў добрым стане, бо яго карпатліва абслугоўваюць.

— Сёлета плануем замяніць прэс-формы для машын, якія купляем толькі ў вытворцы — амерыканскай кампаніі Weiler, — кажа Генадзій Жывень. — Наогул планавая замена абсталявання на новае сучаснае ідзе пастаянна. У планах на гэты год — набыць яшчэ і машыну па разліве раствораў у пакеты ПВХ.

На прадпрыемстве пастаянна абнаўляецца аўтамабільны парк, паколькі пастаўка прадукцыі спажыўцам ідзе сваім транспартам. А цяпер да транспарту прад'яўляюцца пэўныя патрабаванні. Умовы дастаўкі павінны адпавядаць параметрам захоўвання сродкаў. На заводзе заключаюць дагаворы з арганізацыямі, якія праводзяць валідацыю транспарту. Яна робіцца два разы на год — на летні і зімовы перыяды. Вытворцам неабходна даказаць, што лекавыя сродкі зімой не замярзаюць, а летам не пераграваюцца. Практычна кожны год завод закупляе адну-дзве машыны. Гэта айчынныя МАЗы, замежныя аўтамабілі. Яны аснашчаны тэрмаўстаноўкамі, якія рэгулююць тэмпературу ўнутры. На набыццё транспарту трацяцца вялікія сродкі.

У асноўным прадукцыю пастаўляюць на айчынны рынак, часткова — у Расію. Шчыльна працуюць з Туркменістанам і Азербайджанам. Інфузійныя растворы — вельмі спецыфічны лекавы сродак, яны танныя: у асноўным каштуюць да аднаго долара. І вазіць іх на вялікія адлегласці эканамічна немэтазгодна: вялікія транспартныя выдаткі. Нейкі час прадукцыю экспартавалі ва Узбекістан, Казахстан. Цяпер такая нагода адпала, таму што гэтыя краіны пабудавалі свае прадпрыемствы.


Анастасія ЯСКЕВІЧ, мікрабіёлаг мікрабіялагічнай лабараторыі аддзела якасці праводзіць мікрабіялагічныя выпрабаванні кантролю стэрыльнасці лекавых сродкаў у ламінарным боксе.


Водпуск прадукцыі са склада сыравіны і матэрыялаў.


**Антикризисный управляющий ООО «МакБит» –**
ИП Залуцкая Анна Леонидовна (организатор торгов) извещает о проведении 16.03.2020 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Цнянская, 12, оф. 302, открытых торгов по продаже дебиторской задолженности ООО «МакБит»: DOOO «Prodexim»(Республика Сербия) (размер задолженности – 139 568,50 доллара США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения торгов) – начальная цена $111 654,80 доллара США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения торгов; ТРР «Alsero» (Республика Польша) (размер задолженности – 256 145,13 доллара США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения торгов) – первоначальная цена $204 916,10 доллара США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения торгов; ООО «ГазТехРемСтройБел» (Республика Беларусь) (размер задолженности – 44 839,32 BYN) – первоначальная цена 35 871,46 BYN; Шкляр Станислав Алексеевич (руководитель должника ООО «РефОйлПродукт», Республика Беларусь) (размер задолженности – 24 400,00 BYN) – первоначальная цена 19 520,00 BYN; ИП Остапов Д. М. (Республика Беларусь) (размер задолженности – 486,00 BYN) – первоначальная цена 388,80 BYN; ООО «ПрофМа» (Республика Беларусь) (размер задолженности – 274 270,36 BYN) – первоначальная цена 219 416,29 BYN, ООО «Гард Плюс» (Республика Беларусь) (размер задолженности – 327 420,44 BYN) – первоначальная цена 294 678,40 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 86, с даты настоящей публикации по 13.03.2020 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 13.03.2020 г. вкл. на р/с ООО «МакБит» р/с BY12MTBK30120001093300062129 в ЗАО «МТБанк» ЦБУ № 5, г. Минск, код MTBKBY22, УНП 691406165.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 10 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

УНП 691406165



**«Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»! (223610, г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6)**

Во Дворце культуры сахарорафинадного комбината 26 марта 2020 года в 15.00 по адресу: г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6, состоится общее годовое собрание акционеров открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

***ПОВЕСТКА ДНЯ***

1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2019 год и направлениях развития на 2020 год:
• *Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2019 году и основных направлениях деятельности Общества на 2020 год;*
• *Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе;*
• *Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии в 2019 году и заключение по бухгалтерскому балансу и годовому отчету Общества;*
• *Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2019 год с учетом аудиторского заключения;*
• *Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2019 год.*
2. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2020 год.
3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2019 год.
4. Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составляется на 1 марта 2020 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 14.00 до 15.00 по месту его проведения.

Время и место ознакомления с материалами, предоставляемыми для ознакомления лицам, имеющим право на участие в общем собрании: в рабочие дни, начиная с 06.03.2020 г. по 26.03.2020 г. по месту нахождения Общества с 8.00 до 17.00 (ул. Головащенко, 6, каб. 202, холл второго этажа) или по тел. 801795-45328, а в день его проведения – по месту проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

Дирекция, Наблюдательный совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

УНП 600075003



**ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 7»СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Собрание состоится 27 марта 2020 года в здании администрации ОАО «Стройтрест № 7» (г. Минск, пр-т Машерова, 16, зал заседаний) в 15.00. Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах деятельности Общества за 2019 год и утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества.
2. Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2019 год с учетом заключения ревизионной комиссии.
3. О размере и сроках выплаты дивидендов по результатам 2019 года.
4. Утверждение Устава ОАО «Стройтрест № 7» в новой редакции.
5. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться с 6 марта 2020 г. по 26 марта 2020 г. (в рабочие дни) по месту нахождения общества (пр-т Машерова, 16, тел.: 288-14-49, 284-30-75). Список акционеров для регистрации будет определен по состоянию на 1 марта 2020 г.

Для регистрации иметь при себе следующие документы:
акционеру общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность.
*Совет директоров ОАО «Стройтрест № 7».*

УНП 100512859



**Уважаемые акционеры ОАО «Элегант»!**

Очередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант» состоится 24 марта 2020 года в 12.00, регистрация акционеров с 11.00 по 11.45 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, ОАО «Элегант», бухгалтерия.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2019 году и основных направлениях деятельности Общества на 2020 год.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.
3. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса Общества за 2019 год, отчета о прибылях и убытках за 2019 г.
4. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2019 год.
5. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2020 год.
6. Об утверждении прочих расходов за счет прибыли 2019 года, в т. ч. списание кредиторской и дебиторской задолженности с истекшим сроком исковой давности.
7. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О решениях, принятых наблюдательным советом Общества.
10. Об утверждении новой редакции Устава Общества.
11. О сделках Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 1 марта 2020 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться с 9.00 до 11.00, начиная с 1 марта 2020 г. по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия, в день проведения собрания – по месту его проведения.

Справки по телефону (01775) 6-80-74.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет.

УНП 600039318



**27 марта 2020 года в 13.00 состоится очередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Житковичлес»**

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и основные направления деятельности Общества в 2020 г.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2019 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли Общества за 2019 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2020 г. и в первом квартале 2021 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Решение Наблюдательного совета ОАО «Житковичлес» о проведении общего собрания акционеров принято на заседании протоколом № 16 от 19.02.2020 г.

Дата закрытия реестра – 1 марта 2020 г.

Местонахождение ОАО «Житковичлес»: г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80.

Место проведения собрания: г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80.

Время регистрации в день проведения собрания с 12.30 до 12.50.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 20.03.2020 г. (с 14.00 до 16.00 ) и в день проведения собрания с 10.00 до 12.00 по месту нахождения Общества.

УНП 400049968

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Скажыце, доктар...

# СЦІСНУЛА ГАЛАВУ, ЯК КАСКАЙ

**Разнавіднасцяў галаўнога болю некалькі відаў, але менавіта галаўны боль напружання сустракаецца часцей за ўсё. Яго адчуваюць восем чалавек з дзесяці. Як правіла, ён носіць эпізадычны характар, узнікаючы два-тры разы на месяц. Але прыкладна ў 3-5 % перадтвараецца ў хранічны, калі галава баліць ледзь не штодзень. Жанчыны, як натуры больш эмацыйныя, адчуваюць гэты боль часцей за мужчын. Як з ім жыць і змагацца, расказала ўрач-рэфлексатэрапеўт-неўролаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска Алена ГАРБУНОВА.**

*— Алена Віктараўна, у каго ўзнікае галаўны боль напружання?*

— Галаўны боль напружання (ГБН) з'яўляецца найбольш распаўсюджаным варыянтам цэфалгій (галаўных боляў). І сустракаецца як у дарослых, так і ў дзіцячым і падлеткавым узросце. Пік павелічэння захваральнасці прыпадае на ўзрост сямі і 13-15 гадоў. ГБН найчасцей можна звязаць з эмацыйным напружаннем, працяглым нязручным становішчам галавы і шыі, асабліва калі мы працяглы час знаходзімся ў вымушанай позе без дастатковай рухальнай актыўнасці (напрыклад, доўга сядзім перад камп'ютарам), а таксама з працяглай канцэнтрацыяй увагі і парушэннем сну.

*— Як часта з'яўляецца такі боль?*

— Існуе тры асноўныя падтыпы ГБН. Нячасты эпізадычны турбуе пацыента менш за адзін дзень на месяц. Ён узнікае як рэакцыя на перастамленне, развіваецца паступова, нарастаючы на працягу некалькіх гадзін. У такім выпадку галаўныя болі не турбуюць падчас сну і адсутнічаюць у момант прабуджэння раніцай. Цячэнне гэтага захворвання стабільнае, а прагноз спрыяльны. Другі падтып — часты эпізадычны ГБН. З ім чалавек вымушаны жыць ад аднаго да 14 дзён на месяц. У такім выпадку ўзнікненне галаўнога болю звязана з больш-менш доўгім стрэсавым перыядам. Хранічны ГБН — з частатой больш за 15 дзён на месяц, непакоіць штодзённа ці амаль кожны дзень і ўзнікае без яўных правакуючых фактараў.

Акрамя таго, ГБН падраздзяляецца на два падтыпы ў залежнасці ад таго, уцягваюцца або не перыкраніяльныя мышцы (да іх адносяцца шыйныя, жавальныя і мышцы, якія прымаюць удзел у маўленчай актыўнасці і мімічныя, а таксама мышцы ўнутранага вуха).

*— Як праяўляе сябе боль? Яго можна адрозніць ад той жа мігрэні?*

— У адрозненне ад мігрэні, якая ахоплівае звычайна палову галавы, тыповай праявай ГБН з'яўляецца двухбаковы лёгкі ці ўмераны боль лобна-скроневай і патыліца-цемяннай лакалізацыі. Ён мае сціскаючы непульсуючы характар. Як правіла, пацыенты апісваюць ГБН вобразна і нявызначана: «тупы», «ныючы», «цяжар у галаве», «сціскае, як цесная шапка», «сціскае абручом» ці «нешта цяжкае ціснe на галаву, шыю і плечы». Зноў-такі ў адрозненні ад мігрэні падчас прыступу не бывае светабоязі, млоснасці, ірвоты.

Падчас агляду ўрач шляхам пальпацыі абавязкова высвятляе, ці няма ў пацыента павышанага напружання перыкраніяльнай і шыйнай мускулатуры. Як правіла, пры ГБН хворы адзначае балючасць гэтых мышц і ўчасткі павышанай адчувальнасці. Дарэчы, існуе ўзаемасувязь паміж напружаннем і балючасцю пры пальпацыі мышцаў скальпа, шыйна-варатніковай зоны і частатой і інтэнсіўнасцю эпізодаў ГБН з тыповым узмацненнем праяў у болевы перыяд.



Як я адзначала, боль можа правакаваць эмацыйнае напружанне. Прычым ГБН нярэдка можа спалучацца з болямі іншай лакалізацыі — у ніжняй частцы спіны, вобласці жывата, сэрца.

*— Ці можна самастойна справіцца з прыступамі ГБН?*

— Насамрэч, нягледзячы на шырокую распаўсюджанасць, толькі малая частка пацыентаў звяртаецца па медыцынскую дапамогу. У першую чаргу гэта звязана з тым, што большасць людзей мае ГБН з частатой радзей за адзін раз на месяц і нізкай інтэнсіўнасцю. Ён, як правіла, праходзіць самастойна ці пры дапамозе простых безрэцэптурных абязбольвальных прэпаратаў. Такі боль звычайна нязначна ўплывае на якасць жыцця.

Асобныя эпізоды ГБН бываюць кароткачасовымі — 30—120 хвілін і купіруюцца самастойна нават без прэпаратаў, а на фоне адпачынку, з дапамогай рэлаксацыйных метадаў і сну. Медыкаментозную тэрапію ўрач падбірае індывідуальна, калі болевы сіндром істотна ўплывае на якасць жыцця і паўсядзённую актыўнасць. А вось пры працяглых эпізодах ГБН неабходна як мага хутчэй купіраваць болевы сіндром для зніжэння рызыкі хранізацыі і як мага хутчэйшага аднаўлення хворага. Тут варта звяртацца да ўрача.

*— Ці можна пазбавіцца ад гэтага болю назаўсёды?*

— Тут, як і пры прызначэнні лячэння, важна ўлічваць індывідуальныя асаблівасці пацыентаў: вагу, узрост, пол, асаблівасці абмену рэчываў, наяўнасць спадарожных саматычных і эндакрынных паталогій, асаблівасці міжасабовых узаемаадносін. Падыход да лячэння ГБН грунтуецца на ступені парушэння якасці жыцця з улікам гэтых індывідуальных асаблівасцей.

Адным з найбольш эфектыўных метадаў лячэння ГБН з'яўляецца рэфлексатэрапія. Яна мае псіхатропнае, супрацьболевае, міярэлаксуючае і рэпаратыўнае (накіраванае на паляпшэнне кровазвароту ў тканках і стымуляцыю абменных працэсаў у іх) дзеянне. Магчыма выкарыстанне шырокага спектру метадаў рэфлексатэрапіі, у прыватнасці, кропкавага масажу, паверхневай шматігольчатай стымуляцыі, мікраігалатэрапіі, іглаўкалывання і лазернай рэфлексатэрапіі.

У большасці пацыентаў з ГБН адзначаецца паляпшэнне на фоне прымянення асноўных нялекавых метадаў: гігіены сну, рэгулярнай аздараўленчай спартыўнай нагрузкі, рэжыму харчавання і выключэння правакатараў, а таксама метадаў рэлаксацыі і кагнітыўна-паводзінай тэрапіі.

*— Што можна парэкамендаваць у якасці прафілактыкі рэцыдываў ГБН?*

— З цягам часу ГБН можа прагрэсіраваць. Таму для такіх пацыентаў надзвычай важна арганізаваць здаровы лад жыцця, рацыянальныя заняткі фізічнай культурай, папярэджваць разумовае перапрацаванне, пазбягаць стрэсавых і канфліктных сітуацый. Калі немагчыма ліквідаваць негатыўныя псіхаэмацыйныя ўздзеянні, то можна парэкамендаваць розныя віды псіхатэрапіі.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Важна памятаць**

Падчас цікавай работы (калі знікае псіхагенны фактар) можна забыць пра ГБН.

Таксама можна пазбавіцца ад болю фізічным адцягненнем увагі — карысныя штодзённая гімнастыка, плаванне, хадзьба пешшу.

Вельмі важныя станоўчыя эмоцыі: сустрэчы з любімымі людзьмі, жаданыя пакупкі, наведванне кіно і тэатра. Таму радуйце сябе часцей!

На прыёме

# МАСТАПАТЫЯ — ХВАРОБА ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

## Як сучасны лад жыцця адбіваецца на здароўі жанчыны



**60 працэнтаў прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва маюць змены ў структуры малочнай залозы. Што трэба ведаць, каб засцерагчыся ад развіцця анкалагічнага працэсу, які набор прадуктаў паляпшае стан здароўя жанчыны і як часта трэба звяртацца па кансультацыю да ўрача? Адказвае на гэтыя пытанні загадчык анкалагічнага аддзялення № 2 Гродзенскай універсітэцкай клінікі, урач-анколаг-хірург вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Аляксандр ХОМБАК.**

У 90 працэнтах выпадкаў, калі пацыенткі прыходзяць на прыём, урачы канстатуюць змены ў структуры малочнай залозы, у прыватнасці мастапатыю, адзначае суразмоўца. Чаму так адбываецца? Нашы бабулі і прабабулі не мелі «жаночых» праблем у такой колькасці. Спецыяліст тлумачыць гэта зменай ладу жыцця сучаснай жанчыны, калі яе функцыя ўжо не зводзіцца выключна да дзетанараджальнай... Таму і называе мастапатыю хваробай цывілізацыі.

Плюс нагадваюць пра сябе не самыя карысныя звычкі, напрыклад, харчаванне фаст-фудамі і «гаджатавы» лад жыцця з вечара да ранку. Усе гэтыя, здавалася б, звыклыя складнікі нашага імклівага свету адбіваюцца на выпрацоўцы гармонаў у жаночым арганізме і іх метабалізме. Адсюль і ўзнікаюць рознага кшталту змены ў структуры малочнай залозы.

Што рабіць? Сачыць за сваім харчаваннем, пераконвае суразмоўнік. Перагледзець рацыён харчавання на карысць ужывання натуральнага (не паўфабрыкатаў) нятлустага белага мяса, напрыклад, курынай грудкі або індычкі, марской рыбы (добрая ў гэтым выпадку скумбрыя). Стол павінен быць максімальна вітамінізаваны, багаты на раслінныя рэчывы, з мінімальнай колькасцю жывёльных тлушчаў. Безумоўна, важныя і напоі: варта адмовіцца ад тых, што ўтрымліваюць шмат цукру і кансервантаў. У якасці выключэння дапушчальныя хатнія закаткі. І дарэчы, алкаголь таксама на стале лішні. Хоць прамых сведчанняў уздзеяння градуса на развіццё наватвораў няма, але навукоўцам вядома аб яго апасродкаваным уплыве.

Акрамя таго, спецыяліст звяртае ўвагу на фізічную актыўнасць: сучасная жанчына ў пагоні за кар'ерай не павінна «прырастаць» да крэсла, — пажадана знаходзіць час на заняткі фізкультурай і спортам. Гэтая добрая звычка, дарэчы, нядрэнна дапамагае спраўляцца са стрэсам. Як вядома, хранічны стрэс прыводзіць да зменаў у гарманальнай сістэме і, як следства, зменаў у структуры малочнай залозы. Сама па сабе мастапатыя не нясе пагрозу жаночаму здароўю, але ўяўляе небяспеку з пункту гледжання фактару рызыкі анкапаталогіі.

— Недасыпанне, дрэннае харчаванне, начны лад жыцця не праходзяць бясследна, а могуць абярнуцца гарманальным дысбалансам, — тлумачыць Аляксандр Хомбак. — На яго фоне з'яўляюцца мастапатыі, унутрыпратокавыя папіломы, фібраадэнаматоз, якія з цягам часу могуць прывесці да развіцця анкалагічнага працэсу.

Што трэба ведаць? Самае важнае — кантраляваць структуру малочнай залозы. Для гэтага самастойна пальпаваць яе штомесяц у сярэдзіне цыклу. З якога ўзросту варта займацца самаабследаваннем? Па словах суразмоўніка, з моманту палавога саспявання дзяўчыны. Пры любых сумненнях неабходна звяртацца да доктара. УГД-даследаванне малочных залоз у прафілактычных мэтах жанчынам пажадана праходзіць штогод, пры зменах — паказаны дынамічны кантроль раз у паўгода або раз у квартал. Рэнтген-мамаграфія — з 45, скрынінг — з 50 гадоў.

— Сучаснай жанчыне неабходна пераасэнсаваць свой лад жыцця і знайсці разумны баланс паміж выгодамі цывілізацыі і захаваннем уласнага здароўя, — рэзюмуе суразмоўнік.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Простая мова

# АДНОЙЧЫ ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ ПАСЛЯ...

**Ад сумнага да смешнага — крок. Як і назад. На вуліцы дзве кабеты сустрэліся. «Нешта ты змарнелая, сумная, — прызнала адна. — Можа, сталася што?» — «Так, — цяжанька ўздыхнула другая, — свёкар памёр...» — «Бяда... Разумею... Ды ў каго яе няма? І ў мяне ж вось таксама...» — «?!» — «Ноччу ровар укралі».**

**...З гэтай нагоды тая жанчына (ці іншая...) у міліцыю пайшла. Там сталі шукаць. Затрымалі падазраванага, учынілі допыт: «Лепей, — кажуць, — прызнайся, што ты ўкраў». — «Не! Далібог! У мяне ёсць гэта... Ну як яго? Слова забыўся... А, успомніў: алібі! Я сёння ноччу гарэлку гнаў. Можаце пад'ехаць праверыць — трубкі яшчэ цёплыя будуць».**

**...Жыццё нібы тое кіно: алібі альбо няма, альбо ёсць — жалезнае.**

## Бо жывы!

У той сям'і абавязкі падзелены. За гаспадыняй — кухня, за гаспадаром — прыборка жытла: выціранне пылу, мыццё падлог, чыстка дываноў... Прычым не толькі ў сваёй кватэры — як мінімум раз на тыдзень яны ездзяць да бацькі (ён жыве адзін) — гатуюць ды прыбіраюць там — часам, на жаль, са скандалам, бо дзед у сваё амаль 90 можа з вуліцы ў кватэру нанасіць пяску, любіць параскідаць рэчы, напэцкаць рознага посуду, накрышыць у ложак пернікаў.

— Ну вы ж бы акуратней! — ушчуваюць дзеці старога.

— І што тады? — бароніцца ён і ведае чым. — У мяне стане чыста, прыгожа, усё будзе на месцах... Наташа прыйдзе (гэта сацыяльная работніца) і спалохаецца — падумае, што я памёр. А так ёй з парога відно — жывы!

Дзякуй богу!

## Вытворцы... Гэта ад «вытварыць»?

Справа жыццёвая, як казаў Карлсан: прыяцелька хацела купіць сабе куртку. Для гэтага пры зручных выпадках забягала ў крамы, штосьці прымярала, але... У адной апратцы падабаўся колер, у другой — фасон, якасць тканіны, кошт... А вось так, каб усё, — ну не здаралася: жанчына хадзіла ў старым, пакуль аднойчы не «зачапілася» вокам за... паліто, пакуль (проста так, без ніякіх намераў), не ўскінула яго на плечы, не пакруцілася перад люстэркам, не засунула рукі ў кішэні. Яны, што важна, былі цёплыя, мяккія, глыбакаватыя...

Карацей, з той крамы пакупніца пайшла з абноўкай. І дома яе не зганьбілі — ні сама, ні сямейнікі. Адзінае — спыталі: «А чаму паліто? Ты ж шукала куртку?»

Адказала (уголас), што спадабаўся фасон, што падышоў памер, што гэта — пры тым жа кошце — больш выгадна... А вечарам і сама сабе прызналася, што на пакупку «падбілі»... кішэнькі — зручныя, глыбакаватыя, пашытыя з нейкай незвычайна мяккай тканіны. І спатрэбілася яе — дзве латкі, не болей.

## Чалавек мяркуе...

На крамцы абвестка (літары з аршын!): «У продажы — тэрмастойкая бялізна!»

У іншыя зімы яна, відаць, раскупілася б, як гарачыя піражкі. Сёлета (15 лютага ў Мінску расцвілі прымулы) — амаль нікому не патрэбная.

А нехта ж хацеў, разлічваў капейку зарабіць на продажы футраў, шапак, зімовага абутку.

Не лёс.

## Як бы рабіць, каб... не рабіць?

Баялі, пасля васьмі ўрокаў у школе настаўніца зайшла ў аўтобус, павіталася, сказала: «Сядайце, дзеці!»

А ўсё таму, што культурная, хоць і стомленая.

Мы бываем не лепшымі, але ж гэта ўжо, як рэфлекс — на ўваходзе ў памяшканне (крамку, цырульню, кавярню, ліфт, нейчы кабінет) — паздароўкацца. І (як правіла) пачуць адказ.

...У якасці выключэння хіба шапік пры доме, бо там — у лепшым выпадку — могуць вочы падняць. Мымры нейкія, што здзіўляе — абедзве.

Думалі, плацяць дзяўчатам мала, з-за таго і настрой адпаведны. А з іншага боку, за што ім плаціць, калі дрэнна працуюць?

Зрэшты... Надоечы адна з маладзіц (новенькая?) не толькі павіталася — памкнулася (ці не воўк недзе здох?) дапамагчы ў выбары тавару.

Не рублём той раз падарылі і дзве «старыя»...

Вечарам зразумелі: у крамку іх начальніца прыязджала — правярала работу. Пры ёй, ну вядома ж, трэба было і вітацца, і ўсміхацца, а без...

Ходзяць тут усялякія — «мозг выносяць».

## Чужая душа

З вазонамі ў новыя кватэры пераязджалі многія, — на падаконніках лесвічнай пляцоўкі ставіла толькі Люся. «Які сэнс? Іх жа пакрадуць!» — казалі ёй суседзі. І мелі рацыю: першыя зніклі фіялкі — яны вельмі хораша цвілі. І раслі ў маленькіх гаршчочках...

Той, хто забраў, магчыма, знайшоў ім лепшае месца. Любуецца цяпер...

І няхай!

Адно цікава: ці ўспамінае пры тым, дзе ўзяў?

А калі ўспамінае, то што адчувае?

## Не пагладзіць...

Цётка Ніна з восені ў горад збіралася. Казала: «Кватэра ў дачкі вялікая, зяць не п'е, запрашаюць, то я і пажыву — зіма кароценькая будзе».

«Укараціць» яе цётка разлічвала на месяц-другі. Вярнулася — праз два тыдні. Не змагла, кажа, у горадзе: ноччу — няма чым дыхаць, днём — няма з кім пагаварыць. А галоўнае гаспадарка свая (сабачка з катом)



з галавы не выходзіць! Цётка іх на суседку пакінула — непітушчую, надзейную: і дагледзіць яна, і пакорміць... Але ж (даслоўна): «Дзеці, работа — ёй вечна часу няма: не пагладзіць».

Без гэтага, выходзіць, нельга ні кату, ні сабачку.

А чалавеку — можна?

## Форс марозу не баіцца?

Дурная мода: на галаву надзець шапку, два капюшоны (ад байкі і ад курткі), на шыю накруціць даўжэзны шалік, а ногі пакінуць... голымі. Так-так, бо порткі ў многіх кароткія, вузкія, а шкарпэткі і наогул часам падобныя да «слядкоў» — надзяваюцца хіба на падэшву, костачкі застаюцца на холадзе... Форс марозу не баіцца?

У маладосці, магчыма, так, але ж потым...

Кажуць, чвэртка таго, што мы ядзім, падтрымлівае наша жыццё, тры чвэрткі — падтрымліваюць дактароў...

Тое ж, відаць, і з вопраткай-адзеннем?

## Аднойчы. У гасцях...

Казка пра Папялушку — сучасны варыянт. Дзяўчына — працавітая, разумная, добрая, аднак знешне нічым такім не адметная — трапляе на баль і робіць там амаль нечуванае: прыцягвае ўвагу прынца! Чым? Ніколі не здагадаўся б! Тым што, пачуўшы фразу: «Паглядзіце, колькі тут зорак!», узнімае галаву — глядзіць у неба (усе астатнія глядзяць па баках)...

У сталіцы і сапраўды зоркі побач (нават без балю): з нейкай — можна ехаць у метро, поруч сядзець у тэатры ці кавярні, альбо... заўважыць на вуліцы, проста азірнуўшыся:

— Саша, ты?! Не пазнаеш?

— Не, — усміхаецца вядомы артыст.

— Ну як жа? Успамінай! — загадвае чалавеку пажылая бландзінка. — Аднойчы, гадоў 20 назад, мы з табой былі ў гасцях у...

Жанчына прыгадвае прозвішча гаспадароў, іх месца жыхарства, падрабязнасці таго гасцявання... Саша — бездапаможна круціць галавой: маўляў, прабачце, але...

Ён гэтага не кажа, але ж нам «чутно», што праз 20 гадоў цяжка пазнаць нават тую жанчыну, з якой (прабачце), можа, быў у ложку, а ўжо недзе ў гасцях...

Час мяняе нашых куміраў. Нас — таксама. Але другое мы заўважаем менш.

## Еш з галаду — любі змоладу

Вечар, тэлевізар, з экрана і на ўвесь дом нясецца заліхвацкае:

*«Ой, гора ж мне, гора,*
*Што я нарабіла!*
*У яго ёсць жонка,*
*А я палюбіла!»*

Гэта, апошняе слоўка, як выглядае, найболей цешыць дзеўку-пяюху!

Сэнс першых двух слоў — пра гора — дойдзе потым.

Калі яна не разлюбіць...

## Нямы? Не мы!

З правілаў жыцця: перш чым сысці з дому, трэба праверыць, ці выключаны святло і газ, ці з сабой тэлефон, праязны кашалёк, ключы... Асобным радком — кніжка. У адной зачапілі радкі: «...Загінула, у нябыт сышло каля 80 працэнтаў усіх малых рэчак. Удумаемся, — заклікаў светлай памяці Ніл Гілевіч — каля 80 працэнтаў! Гэта значыць, з кожных дзесяці рэчак і рэчачак васьмі не стала...»

І ў другой амаль пра тое ж Генадзь Бураўкін:

*«Там, дзе не шануюць роднай мовы,*
*Мялеюць рэкі, нішчацца дубровы,*
*Народ той мёртвы,*
*А той край нямы».*

## Каб помнілі...

Свята (у сяброў юбілей), мы выбіраем кветкі. І маем з чаго, бо ў сталіцы нават зімой якіх хочаш руж, гваздзікоў, хрызантэм...

Раімся, разглядаем, пытаемся ў прадавачкі, што пачым (тавар ёй, мусіць, нядаўна падвезлі, бо шмат што пакуль без цэннікаў)...

Жанчына з ахвотай адказвае (што прыемна, — таксама па-беларуску), паказвае, складае ў букет... А тым часам побач збіраюцца людзі: нехта з іх — ну вядома ж — каб купіць кветкі, нехта — каб паслухаць гаворку, а то і ўклініцца.

— *Ну что вы там щебечете?* — пытае ў нас вялікі п'янаваты пузач. — *Хотите сказать, что в Беларуси другой язык есть? Но кому?*

— Не вам, — усміхаемся ў адказ, — бо вы сёння наўрад ці зразумееце. А вось сабе ды людзям, каб помнілі, яно і нялішне нагадаць, што тут і мова іншая, і краіна.

## Фанетыка

...Пісаць вучылі ў школе, потым на журфаку, на працы.

Тут настаўнікі былі розныя. Найбольш «даставаў» адзін: маючы абсалютны музычны слых, цудоўна граючы на некалькіх музычных інструментах, ён, як тады здавалася, чапляўся да кожнага слова. Ну вось напрыклад: пішаш нататку аб тым, што ў мікрараёне Чыжоўка пабудаваны новы дзіцячы садок. Прэтэнзій да аднаго сказа як мінімум дзве: па-першае, нельга пабудаваць стары... А па-другое *«пабудаваны новы»* — цяжка вымаўляецца, непрыгожа гучыць... У гэтым (даслоўна): *«фонетика плохая»*. А таму — як прысуд — нататка ідзе не ў набор, а назад на аўтара — папраўляецца, шліфуецца, даводзіцца да стандартаў, якіх мо ніхто не бачыў... І толькі потым...

Адтуль, з тых самых часоў, засталася звычка шукаць дакладныя словы, «падганяць» іх, як пазлы, каб кожны заняў сваё месца, каб сказ загучаў...

Во колькі ўспамінаў з-за... назвы маленькай кавярні «Стихи Кофе Поцелуи»...

Напісалі б, здаецца: «Вершы Кава Пацалункі», і загучала б! Як на мяне, куды прыгажэй!

## Як бы лодку назавяце...

Прыяцелька зблытала вуліцу Даўмана з вуліцай Берсана. Яе муж (і, дарэчы, карэнны мінчанін) Камуністычную з Інтэрнацыянальнай, сама надоечы — Солтыса з Судмалісам.

Пытанне на засыпку: ці можна было б зблытаць з іншай нашу Дамінікanскую, Зыбіцкую, Бернардынскую? Ці вуліцу Быкава (калі б яна ў Мінску была... Няма)? Затое ў краіне звыш сямісот вуліц носяць імя Леніна, звыш пяці тысяч — Цэнтральных, звыш чатырох (зноў жа тысяч) Лясных ды Садовых...

Назвы, як моладзь кажа, «ні аб чым». Мо адтуль блытаніна?

## «Эстафета»

Дзеці сужэнцаў К. жывуць у горадзе, яны самі — у вёсцы. Там у іх цёплы дом, сотак з трыццаць зямлі... Там у іх лес і рэчка. Праўда, на рыбалку туды гаспадар амаль не ходзіць, бо марна: калі нешта і зловіш, то хіба для ката...

Зрэшты, неяк сабраліся. Удвух з унукам. Бабуля з той нагоды тры ладных акунькоў размаразіла. Дзед іх на рэчцы ў сетку «загнаў». Малы нараніцу выцягнуў! Шчасця — на ўвесь бераг было! А потым — на ўсю вёску і хату, бо тых рыбак (кожную не раз пацалаваўшы) малы сам пачысціў, сам, можна сказаць, зварыў юшку, разліў па талерках: як бабуля прызнала, накарміў сям'ю.

...Калі-небудзь, калі падрасце ці вырасце, хлопчыку, ну напэўна ж, раскажуць, як яно папраўдзе было. І той, дасць бог, усё зразумее. Можа, нават сам вось гэтак жа падмане свайго сынка ці ўнука.

Галоўнае, каб у вёсцы застаўся дом. І лес. І рэчка.

## Чужыя беды — наша суцяшэнне?

«Хочаш спаць спакойна, — заплаці падаткі, аддай даўгі»... Але ж гэтага мала, калі з усіх бакоў «аблажаць» непрыемнасці, прычым так...

А суседзям — «пофіг дым», у іх — чарговая гулянка — як выглядае, з танцамі. Яны чаргуюцца: нешта рытмічнае, потым павольнае, зноў рытмічнае і зноў...

*«...А я нашел другую,*
*Хоть не люблю, но целую.*
*А когда я ее обнимаю,*
*Всё равно о тебе вспоминаю».*

Шкада чалавека! А найболей — тую, другую...

На фоне іх «непрыемнасцяў» хоць крыху мізарнеюць свае.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# ДОЖДЖ ЛІЎ ЯК З ВЯДРА

АЛЕСЬ БАДАК

*Апавяданне*

— «Дождж ліў як з вядра»... Чаму «як з вядра»?

— Што?

— Чаму «як з вядра»?

— Устойлівы выраз такі. Усе так гавораць.

Мужчына гадоў пяцідзесяці страсянуў плячыма:

— Усе? Для аўтара гэта хутчэй мінус, чым плюс.

Ён дастаў з левай кішэні пінжака насоўку, але кропелька поту паспела скаціцца па лбе і ўпала на рукапіс апавядання, які ляжаў перад ім на маленькім століку. Мужчына адчуў сябе крыху няёмка, і яму стала ўсё цяжэй утаймоўваць у грудзях раздражненне, выкліканае жнівеньскай духатой у гэтым велізарным кніжным павільёне, а больш за ўсё прадчуваннем таго, што прыехаў сюды дарэмна.

«Жанчыны-пісьменніцы — матылькі, а мужчыны-пісьменнікі — пчолы»,— падумаў ён, прыклеіўшыся матавым позіркам да фразы пра дождж, які ліў як з вядра, — далей чытаць не хацелася. Як ёй растлумачыць, што гэта ніякая не проза?

Да сённяшняй сустрэчы ў іх была толькі тэлефонная размова. Яна патэлефанавала яму з Масквы месяц таму, вельмі прасіла прыехаць на кніжны фестываль, каб прэзентаваць яго кнігу, якая сёлета выйшла ў іх выдавецтве. На жаль, сказала яна, у рэдактара, што займаўся кнігай, на дні фестывалю якраз прыпаў адпачынак з паездкай у Турцыю, таму прэзентацыю даручана правесці ёй. Праўда, яна ўсяго тры месяцы як працуе ў выдавецтве, але нічога, справіцца. Ён даў згоду не ёй, а яе прыемнаму голасу, і цяпер, калі нарэшце ўбачыў дзяўчыну, адчуў сябе падманутым, быццам яго разыгралі, паабяцаўшы адно, а наяве паказаўшы зусім іншае. Але больш за ўсё ён адчуваў сябе падманутым праз тое, што, па ўсім відаць, ніякай прэзентацыі яго кнігі сёння не будзе. Гадзіннік паказваў 11.55, да пачатку заставалася пяць хвілін, а некалькі дзясяткаў пластмасавых крэслаў, расстаўленых паўкругам вакол невялічкай імправізаванай сцэны, на якой ён цяпер сядзеў у такім жа пластмасавым крэсле, усё яшчэ былі пустыя.

Цікава, як яна будзе выкручвацца?

Яна заўважыла, што ён паглядзеў на гадзіннік:

— Нам выдзелілі не лепшую пляцоўку — у самым аддаленым ад галоўнага ўвахода кутку.

Гэта было праўдай: асноўная маса наведвальнікаў прахаджвалася па цэнтры павільёна, але найбольш людзей тоўпілася каля цэнтральнай сцэны, падысці да якой ужо каторы раз заклікаў па гучнай сувязі прыемны жаночы голас, абяцаючы сустрэчу з аўтарам бестселераў у жанры сентыментальнай прозы, прозвішча якога яму ні аб чым не гаварыла.

А на што ён разлічваў, калі пагаджаўся прыехаць? Хто тут яго ведае, хто тут яго чытаў?

«Дождж ліў як з вядра». Даўся яму гэты дождж. Зрэшты, каб пісаць бестселеры ў жанры сентыментальнай прозы, і трэба думаць такімі трафарэтнымі фразамі.

— Хочаце кавы?

Ну вось, намёк на тое, што выступленне варта адмяняць.

Ён кінуў позірк на пластмасавыя крэслы, якія стаялі, нібы салдаты па стойцы смірна, у тры шарэнгі, чакаючы каманды. І тут жа на першым радзе, якраз па цэнтры, ён убачыў яе. Яна сядзела ціха, як студэнтка-выдатніца на лекцыі строгага прафесара, але, здавалася, ён адчуў у ёй унутраную напружанасць, быццам яна баялася, што заняла чужое месца і яе вось-вось могуць прагнаць.

У гэты момант ён адчуў у сабе азарт, які не раз прыходзіў да яго за некалькі імгненняў да адчаю і штурхаў на ўчынкі, на якія ён у спакойным стане быў не здатны.

— Кавы? Дванаццаць гадзін, давайце пачынаць.

Ён убачыў у вачах дзяўчыны недаўменне, якое толькі дадало яму азарту.

— Прадстаўляць мяне не трэба.

Ён лёгка ўзняўся з крэсла, прывычным рухам падхапіў са століка мікрафон і ступіў некалькі крокаў наперад. Цяпер ён глядзеў толькі на яе, і на яго вуснах гуляла хуліганская ўсмешка.

— Добры дзень! Я і сам не буду прадстаўляцца: думаю, у маёй сітуацыі гэта лішняе. Зрэшты, было б разумна, калі б усе выдавецтвы ўвогуле адмовіліся ставіць на вокладках кніг імя аўтараў і назвы твораў. Паверце, тады нашмат узрасла б колькасць тых, хто прачытаў «Вайну і мір», і зменшыліся б тыражы кніг многіх модных сёння аўтараў. Нават страшна ўявіць, колькі людзей ва ўсім свеце кінулі б займацца пісьменніцтвам і нарэшце сталі б рабіць тое, чым яны могуць прыносіць большую карысць. Мы не ведаем, хто напісаў «Слова аб палку Ігаравым», але няўжо б яно зрабілася больш геніяльным, калі б мы гэта ведалі? Ёсць у беларускай літаратуры дзевятнаццатага стагоддзя славутая сатырычная паэма: «Тарас на Парнасе». Не чулі? Паверце на слова: паэма, і праўда, цудоўная. Нездарма яе прыпісвалі то Дуніну-Марцінкевічу, то Багушэвічу — ого, у свой час гэта былі зоркі першай велічыні ў нашай літаратуры. А ў гады майго дзяцінства яе вывучалі ў школе. Яе і сёння вывучаюць, але тады яна лічылася ананімнай. А пасля ўстанавілі аўтарства: Канстанцін Вераніцын. Крытыкі разгубіліся: хто гэта? адкуль? Аказваецца, з Віцебскага павета, з вёскі Астраўляны. Хутчэй за ўсё, маці, якая была прыгоннай, нажыла яго ад пана, што пасля даў яму вольную — як кажуць, і на тым дзякуй. Сваю паэму Вераніцын напісаў у дваццаць адзін год, калі вучыўся ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце на агранома. І пайшла яна ананімна па руках — у адным, другім, трэцім спісе. Хто ведае, колькі было гэтых спісаў — сотні, а мо, тысячы. Сучаснік Вераніцына этнограф Еўдакім Раманаў у запале казаў, што паэму тую можна было знайсці ў кожнай хаце. І што, мая дарагая, — ён па-ранейшаму нібы абдымаў сваім позіркам тую, што сядзела перад ім на першым радзе, — думаеце, Вераніцын пачаў біць сябе ў грудзі: гэта я аўтар! Ды кіньце, ён пальцам не паварушыў, каб заявіць пра сябе нават тады — амаль праз трыццаць пяць гадоў, калі паэма ўрэшце была ананімна надрукавана. Ну, але ж ён не ў дваццаць першым стагоддзі жыў! Хацеў бы я паглядзець на таго, хто сёння па сваёй ахвоце гатовы адмовіцца ад такой славы. Мая дарагая, дваццаць першае стагоддзе разбурае літаратуру, як карозія. Але літаратура — гэта не тое, што на паперы, як прывыкла думаць большасць людзей. Літаратура — гэта тое, што ў нас унутры. Друкаванае слова мёртвае, пакуль яно не пройдзе, як вада праз пясок, праз нашы ўяўленні. Дайце прачытаць адзін і той жа тэкст тысячы чалавек: тое, што ў ім напісана, кожны ўявіць па-свойму. Чытач — суаўтар пісьменніка, геніяльны суаўтар. Але гэта злы геній літаратуры! Часам гэта сам д'ябал, які водзіць рукой пісьменніка, прымушаючы таго дзеля славы ці грошай пісаць бульварнае чытво...

Ён зрабіў паўзу, перабіраючы ў галаве тое, з чым можна было б параўнаць бульварнае чытво, але яго думкі перабіў саладжава-мяккі, бы прапушчаны праз мясарубку, мужчынскі голас:

— Можна пытанне?

Ён пераве́ў здзіўлены позірк улева, на самы край імправізаванага зальчыка: ён нават не здагадваўся, што за імі назірае нехта староннi. «Букініст», — сходу прыклеіў яму мянушку, арыентуючыся па вельмі паношаным і даўно не прасаваным цесным касцюме, які быў упору мужчыне, па ўсім відаць, гадоў дваццаць таму, і па яшчэ больш пацёртай кнізе, якую той прыціскаў да грудзей, быццам ікону.

— Калі ласка.

— Вы не дапускаеце, што колькасць людзей, якія прыйшлі на сустрэчу з вамі, — пераканаўчае сведчанне таго, што сёння пераважная большасць чытачоў лічыць інакш: наша эпоха, на жаль, пакуль не нарадзіла свайго Льва Талстога, і ў гэтым не іх віна. Нельга вінаваціць іх у тым, што ў спякотны дзень яны ў цені дрэў здавальняюцца цішынёю, а не спрабуюць зразумець мову лістоты: прынамсі, для таго, каб навучыцца яе разумець, спачатку павінен падняцца вецер, што ад іх ніяк не залежыць.

Словы «букініста» яго нікольки не здзівілі. Ён чуў іх дзясяткі разоў у розных аўдыторыях і ў тэлеэфіры, чытаў на старонках газет і ў інтэрнэце. Яны мянялі, часам да непазнавальнасці, сваё гучанне, але сэнс іх заставаўся той жа: сёння вялікай літаратуры няма. Ён таксама адказваў па-рознаму, захоўваючы ў сказаным адзін і той жа сэнс.

— Прамоўленыя словы часта з'яўляюцца падманнымі, заўсёды праўдзівае толькі маўчанне, таму якраз яго і трэба вучыцца разумець, — адказаў ён упэўнена, перад гэтым паспеўшы падумаць, што ў голасе «букініста» была не іронія, а, хутчэй, спачуванне. — Менавіта ў маўчанні схаваны глыбіня і мудрасць. У кнізе гэта не тое, што напісаў аўтар, а тое, пра што ён думаў, калі пісаў. Вам не здаецца парадаксальным, што ад сённяшніх пісьменнікаў патрабуюць сучасную «Вайну і мір» тыя, хто талстоўскую эпапею альбо зусім не чытаў, альбо кінуў чытанне дзе-небудзь пасярэдзіне рамана? Хіба такія людзі могуць пазнаць генія сярод сваіх сучаснікаў?

Ён гаварыў спакойна, нават ціха, але дынамік дадаваў голасу цвёрдасці, хвалямі напаўняючы ім паветра. І на гэты голас паступова пачалі ісці людзі — па адным, па два; нехта, крыху запаволіўшы крок, задумліва рухаўся далей, але нехта заставаўся стаяць перад сцэнай альбо займаў адно з вольных пластмасавых крэслаў.

— А вы не дапускаеце, што час геніяў у літаратуры незваротна прайшоў? — спытаў малады чалавек, з тых, што любую тэорыю падвяргаюць сумненню. — Мы жывём у постіндустыяльную эпоху, і чалавецтва ўвесь свой разумовы і творчы патэнцыял у першую чаргу накіроўвае на тое, што ў дадзены момант больш запатрабаванае.

— Не дапускаю, таму што геніі не належаць канкрэтнаму часу альбо канкрэтнай эпосе, як здаровае дрэва не належыць толькі зямлі ці толькі небу. Іх фізічнае з'яўленне свету нішто ў параўнанні са з'яўленнем духоўным, якое не ведае часавых і прасторавых межаў. Вы сказалі: у дадзены момант, быццам гэта самы важны арыенцір у творчай дзейнасці. Але той, хто, ідучы, увесь час глядзіць сабе пад ногі, не бачыць, што адбываецца наперадзе, а той, хто, ідучы, глядзіць наперад, ведае, што ў яго пад нагамі. Страх быць незапатрабаванымі ў дадзены момант — гэта доля тых, хто піша бульварнае чытво, гэта якраз тыя, хто ўвесь час глядзіць пад ногі, таму кругагляд іх вельмі вузкі, а век іх твораў вельмі кароткі.

— А вы самі можаце назваць хоць бы аднаго літаратурнага генія нашай эпохі? — спытала жанчына сярэдніх гадоў са знешнасцю, якая і ў такім узросце апраўдвала яе какецтва — яно чулася ў кожным пытанні, адрасаваным незнаёмаму мужчыну.

Ён пацісну́ў плячыма:

— Не магу.

Слухачы, якія стаялі перад ім шчыльнай сцяною, засмяяліся.

— Ваш смех быў бы яшчэ больш гучным, калі б я назваў яго імя. Прычым, не важна, чыё імя прагучала б. І справа не толькі ў тым, што называць імя геніяў — гэта прэрагатыва нашчадкаў, а не сучаснікаў. Урэшце кожны чалавек мае права на сваю думку, як кожная эпоха мае права на сваю праўду. Але справа яшчэ ў тым, што вы самі не хочаце, каб я яго называў.

— Як гэта? — здзівілася какетка.

— Вы не хочаце гэтага, таму што ён вам непатрэбны. Ён вам чужы. Ён лішні ў вашым свеце, у якім іншыя героі: вы штодня бачыце іх у скандальных тэлевізійных ток-шоу, чытаеце ў інтэрнэце пра іх каханак і пазашлюбных дзяцей, пра іх п'яныя выхадкі і невылечныя хваробы. Часта вы абураецеся іх паводзінамі, але ў душы вам прыемна, што яны такія ж, як і вы, а можа, горшыя за вас. У іх вы знаходзіце апраўданне сваім парокам і слабасцям, таму вам не патрэбны геній, які будзе даказваць, што апраўдання вашым парокам і слабасцям няма і не можа быць. Прабачце, я не маю на ўвазе канкрэтна вас, паколькі мы з вамі зусім незнаёмыя. Проста ў вашым голасе я чую голас часу, і яму адказваю. Самае ж страшнае, калі заўтра з'явіцца геній пароку, які апяе і ўславіць усё тое, што сёння пакуль яшчэ лічыцца злом, і ўсе будуць ведаць яго імя, і ўсе стануць яму пакланяцца.

Ён гаварыў і адчуваў сябе так, як заўсёды адчуваў у хвіліны творчага ўздыму: нехта ўнутры цябе шэпча словы, якія ты тут жа паўтараеш, не паспяваючы перад гэтым да канца ўсвядоміць іх сэнс. Азарт прайшоў, на сэрцы з'явіліся лёгкасць і спакой, нібы на моры пасля нядаўняга шторму. Так з ім было нярэдка на выступленнях. Ён ведаў, што самае складанае пачаць, знайсці некалькі першых фраз, якія альбо дазволяць табе завалодаць публікай, альбо настрояць публіку супраць цябе.

І ў гэты момант ён успомніў пра тую, што адзінока сядзела на крэсле перад пачаткам яго выступлення. Як можна было забыць пра яе! І тут толькі да яго дайшло, што на тым крэсле цяпер сядзела тая самая какетка сярэдніх гадоў. «Што ж, бывай, незнаёмка!» — весела падумаў ён, пільна пазіраючы жанчыне ў вочы, і не мог стрымаць усмешку, якую яна зразумела па-свойму і какетліва паслала ў адказ сваю.

Калі гадзіннік паказваў пачатак на другую, ён павярнуўся да выдавецкай рэдактаркі: пара было заканчваць сустрэчу. Некалькі чалавек падышлі, каб набыць яго кнігу і ўзяць аўтограф. Ён доўга думаў, што напісаць какетцы, якая назвалася «проста Святланай», і ўрэшце напісаў коратка: «У кожным чалавеку жыве геній. У вас таксама, таму што вы геніяльны слухач!»

Развітваючыся з выдавецкай рэдактаркай, ён узяў са століка рукапіс яе апавядання.

— Калі вы не супраць, я забяру яго з сабой, каб пачытаць дома ў спакойнай абстаноўцы. У ім нешта ёсць, бясспрэчна. І пра дождж, які там лье як з вядра, я пагарачыўся. Зрэшты, ён ліў і ў Талстога, і ў Дастаеўскага, і ў Гогаля.

— Дзякуй! — узрадавалася дзяўчына. — І дзякуй вам за выступленне. Гэта было здорава! Прызнацца, калі напачатку вы павіталіся з пустой залай, а пасля гаварылі ёй «мая дарагая», я спалохалася.

— Чаму з пустой? — лагодна ўсміхнуўся ён. — На першым радзе ў самым цэнтры сядзела яна. І, як мне падалося, вельмі ўважліва слухала.

— Хто — яна?

— Муха. Звычайная шэрая муха.

Задаволены з'яўленнем разгубленасці на дзявочым твары, са словамі «Я вам напішу з Мінска!» ён накіраваўся да выхаду. Перад ім паслужліва расчыніліся дзверы-аўтамат, выпускаючы яго на вуліцу. Дыхнула вільготнай свежасцю. Неба было зацягнута шэрымі хмарамі. Дождж ліў як з вядра.

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# РЫХТУЕМ ГРУНТ ДЛЯ РОЗНЫХ КУЛЬТУР

**Існуе мноства варыянтаў глебагрунтоў. Каб выбраць правільны, трэба ўлічваць патрабаванні кожнай канкрэтнай культуры. Памідоры, напрыклад, аддаюць перавагу слабашчолачнай глебе з вялікай колькасцю арганікі, азоту і калію. Капуста аддае перавагу зямлі, у якую дададзена вапна і драўняны попел.**

Можна прыгатаваць і ўніверсальную глебавую сумесь. Яна складаецца з дзвюх частак агароднай зямлі, адной часткі перагною або добра перапрэлага кампосту, адной часткі торфу і адной часткі пілавіння або пяску. У залежнасці ад таго, якая культура будзе вырошчвацца, неабходна дадаць у гэты субстрат пэўную колькасць угнаенняў.

| Культура | Колькасць угнаенняў на 10 л субстрату |
|---|---|
| Капуста | 15—20 г аміячнай салетры або мачавіны, 20—25 г суперфасфату, 10 г сернакіслага калію, 25 г даламітавай мукі |
| Агурок | 8—10 г аміячнай салетры, 10—15 г суперфасфату, 10 г сернакіслага калію, 10 г даламітавай мукі |
| Тамат, перац, баклажан | 8—10 г аміячнай салетры, 80 г суперфасфату, 20—30 г сернакіслага калію |

Ні ў якім разе не высейвайце насенне агародніннных культур у чысты перагной або кампост. У іх утрымліваецца вельмі шмат пажыўных рэчываў, дзякуючы чаму саджанцы хутка нарошчваюць зялёную масу і выглядаюць вельмі прывабна. Аднак карані пры гэтым у іх развіваюцца слаба, таму расліны дрэнна прыжываюцца на ўчастку.



Не варта прасейваць кампаненты грунту для расады праз дробнае сіта — такі субстрат пасля паліву будзе «заплываць» і вельмі хутка закісне.

### Як палепшыць пакупны грунт

Не ва ўсіх ёсць магчымасць самастойна прыгатаваць грунт для расады, і шмат хто купляе ўжо гатовы. Але не заўсёды такія глебасумесі адпавядаюць патрабаванням канкрэтных рассадных культур (асабліва гэта датычыцца ўніверсальных глебавых сумесяў).

Асноўным кампанентам універсальнага глебагрунту з'яўляецца торф. Яго недахопы — павышаная кіслотнасць і дрэнная водапранікальнасць. З-за гэтага расліны слаба развіваюцца і адстаюць у росце.

Каб вашы намаганні не зніклі дарма, такі грунт трэба «мадыфікаваць».

1. Дадайце ва ўніверсальны пакупны грунт такую ж колькасць абеззаражанай агароднай зямлі. Калі яе няма, выкарыстоўвайце тое, што ёсць пад рукой — нявыкарыстаны грунт для пакаёвых раслін, зямлю з вазонаў, якая засталася ад кветак, якія прапалі.

2. Каб знізіць кіслотнасць, дадайце трохі мелу або даламітавай мукі (1-2 ст. л. на вядро грунту).

3. Для рэгулявання вільготнасці субстрату можна дадаць крышталі гідрагелю. Толькі варта ўлічыць, што ў вільготным стане іх памер павялічваецца ў 200—300 разоў, таму іх трэба зусім крыху.

## Парады бывалых

Хоць без ягадных кустоў і немагчыма ўявіць сабе дачу, але і клопату з імі шмат. Асабліва складана даглядаць за пладаноснымі галінкамі. Адно ўзвядзенне вакол раслін падпорак-аградак чаго варта!

На зіму гэтыя канструкцыі не пакінеш, таму што яны зламаюцца пад цяжарам засыпаных снегам галінак, а вясной трэба зноўку іх выстаўляць, ды пры гэтым яшчэ і памеры мяняць, бо кроны кустоў пастаянна разрастаюцца.

А можна паспрабаваць пасля збору ўраджаю ўсе галінкі на кустах, на сярэдзіне іх вышыні, прыхопліваць у пучкі шпагатам (не туга!), які трэба прывязаць да калкоў, убітых у цэнтры кустоў (самыя ніжнія галінкі, якія ляжаць на зямлі, адрэзаць).

У такім выглядзе ягаднікі сыходзяць у зіму (галінкі стаяць роўна і не ламаюцца пад снегам) і будуць потым стаяць да наступнай уборкі ўраджаю. Кусты добра ветраюцца, ягады не пэцкаюцца брудам.

## Даты Падзеі Людзі

**26 ЛЮТАГА**

У краіне

**1805** год — нарадзіўся Аляксандр Здановіч, беларускі гісторык, пісьменнік, педагог, кандыдат філасофіі (1831). Скончыў Віленскі ўніверсітэт. У 1834—1863 адах — выкладчык лацінскай мовы і гісторыі Віленскага шляхецкага інстытута, выкладчык гісторыі Віленскай духоўнай семінарыі. Аўтар дапаможнікаў «Нарыс усеагульнай гісторыі для дзяцей», «Храналагічна-гістарычны нарыс сучасных дзяржаў ад V стагоддзя да нашых дзён» і іншых. Член Віленскай археалагічнай камісіі.

**1891** год — нарадзіўся Павел Корчык (сапр. імя Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і Польшчы. У 1907-м скончыў Слуцкае гарадское вучылішча. Быў сябрам Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. З 1924 года працаваў у Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б у Мінску. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны. Аўтар шматлікіх палітычных дакументаў КПЗБ і КПП. У 1936 годзе рэпрэсаваны. Памёр у турме ў 1940-м. Рэабілітаваны ў 1955-м.



**1940** год — нарадзіўся Уладзімір Якаўлевіч Пузыня, беларускі майстар-рэстаўратар нацыянальных музычных інструментаў, які і выконваў на іх аўтэнтычныя мелодыі, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1994). У 1964 годзе скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі, у 1989-м — Мінскі інстытут культуры. У 1965—1978 гадах — артыст Дзяржаўнага народнага аркестра Беларусі імя Жыновіча. Стваральнік музея беларускіх музычных старажытных інструментаў «Беларуская хатка».

У свеце

**1815** год — сасланы на Эльбу колішні імператар Напалеон збег з вострава і 1 сакавіка высадзіўся на поўдні Францыі, адкуль з тысячай сваіх прыхільнікаў рушыў на Парыж.



**1910** год — нарадзіўся Сяргей Георгіевіч Гаршкоў, адмірал флота Савецкага Саюза (1967), двойчы Герой Сацыялістычнай Працы (1965, 1982).

**1935** год — шатландскі вучоны Роберт Уотсан-Уат правёў першыя выпрабаванні прылады, якая атрымала назву «радар» (Radio Detection And Ranging).

**1952** год — прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль абвясціў аб стварэнні краінай уласнай атамнай бомбы.

**1955** год — амерыканскі лётчык-выпрабавальнік Джордж Сміт стаў першым чалавекам, які паспяхова катапультаваўся на звышгукавой хуткасці.

**1966** год — паспяхова прайшоў першы выпрабавальны палёт амерыканскага касмічнага карабля «Апалон» без людзей на борце.

**1980** год — Ізраіль і Егіпет усталявалі дыпламатычныя адносіны, паклаўшы канец шматгадоваму ваеннаму супрацьстаянню.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 8.06 | 18.39 | 10.33 |
| Віцебск | 7.58 | 18.27 | 10.29 |
| Магілёў | 7.57 | 18.29 | 10.32 |
| Гомель | 7.51 | 18.28 | 10.37 |
| Гродна | 8.21 | 18.55 | 10.34 |
| Брэст | 8.19 | 18.58 | 10.39 |

### Месяц

***Апошняя квадра 16 лютага. Месяц у сузор'і Казярога.***

### Імяніны

***Пр.** Марфы, Марыі, Хрысціны, Анатоля, Васіля, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Юльяна.*
***К.** Міраславы, Арнольда, Міраслава, Пятра.*




Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Рамантыка памірае на вачах з кожным годам: мужчыны ўжо перасталі пісаць доўгія лісты з прызнаннямі, страляцца на дуэлях, лазіць у вокны на апошні паверх, каб падарыць букет... Не за гарамі той дзень, калі лайкі пад фота перастануць ставіць.

**Як бы мы лячыліся, калі б не інтэрнэт.**

Самыя нязбытныя мары чалавека ў парадку сталення: 1) быць заўсёды багатым; 2) быць заўсёды здаровым; 3) быць заўсёды маладым.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 387.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 лютага 2020 года.